ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 28 (5034) 19 ліпеня 2019 г.

ISSN 0024-4686

16 +

Абаронца Караткевіча стар. 5

Прапіска творцаў — Мінск стар. 10—11

За кулісамі чакае... Гарцуеў стар. 13

Заставацца беларусамі

Чым жылі нашы суайчыннікі, якія з розных прычын апынуліся ў далёкім ці блізкім замежжы? Як выхоўвалі дзетак, каб тыя не забыліся на свае карані, на што трацілі грошы, як бавілі час пасля працоўнага дня, — на гэтыя ды іншыя пытанні адказвае літаратурна-дакументальная экспазіцыя «У сэрцы з Радзімай», прысвечаная літаратурнай спадчыне беларускіх эмігрантаў XX стагоддзя. Выстаўка, зладжаная ў межах праекта «Збіраем гісторыю беларускай літаратуры разам», працуе ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

У цэнтры экспазіцыі — зялёная карта Беларусі, ад якой, нібы промні сонца, у розныя бакі разыходзяцца стужкі, упрыгожаныя арнаментам. На канцы кожнай з іх — маленькая саламяная птушачка, сімвал беларусаў, якія разляцеліся па ўсім свеце. На асобным стэндзе ўся колеравая гама — сцягі дзяржаў, дзе былі створаны беларускія дыяспары. Іх больш ад трыццаці, яны месцяцца амаль на ўсіх кантынентах.

Працяг на стар. 3 ►

Фота Кастуся Дробава.

Пераможца конкурсу «Віцебск-2019» на XXVIII «Славянскім базары ў Віцебску» Адзільхан Макін.

Вялікая пляцоўка для захавання адзінства

Свята сяброўства, узаемаразумення і падтрымкі. Менавіта так штогод заяўляе пра сябе Міжнародны фестываль «Славянскі базар у Віцебску», які аб'ядноўвае прадстаўнікоў самых розных краін культурай і святочным настроем. Сёлета XXVIII фестываль прайшоў не проста з вялікім размахам: арганізатары паспрабавалі зацікавіць гасцей і жыхароў горада на Дзвіне разнастайнымі сюрпрызамі. Дарэчы, пачаўся 28-мы «Славянскі базар» яшчэ задоўга да адкрыцця. Белы сцяг з сімволікай фэсту ўзвіўся ў неба над горадам 9 ліпеня. Права падняць яго атрымалі пераможцы дарослага і дзіцячага музычных конкурсаў «Віцебск-2018» Марчэл Рошка і Аляксандр Балабанаў.

Традыцыйна старт «Славянскаму базару» даў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, які падчас адкрыцця падкрэсліў, што фестываль у Віцебску не проста традыцыя альбо магчымасць расказаць пра сябе славянскім краінам, але яшчэ і вялікая пляцоўка для захавання адзінства ў межах складанай палітычнай структуры.

Працяг на стар. 4 ►

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 19028

акцэнты тыдня

Свята. «Славянскі базар», на якім за 28 гадоў вырасла цэлае пакаленне, поўны добрых традыцый. Гэта падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас цырымоніі ўрачыстага адкрыцця XXVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Адна з іх — ушаноўваць выдатных артыстаў, чыя творчасць спрыяе ўмацаванню сяброўства паміж народамі. «У гэтым годзе спецыяльную ўзнагароду "Праз мастацтва — да міру і паразумення" мы ўручаем выдатнай спявачцы і добраму сябру не толькі Беларусі, але і Расіі — народнай артыстцы Украіны Таісіі Павалій. У яе асобая гісторыя: у свой час яна стала пераможцай конкурсу маладых выканаўцаў на гэтай сцэне, і сёння яе імя заслужана заблішчэла на плошчы зорак нашага "базару"», — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

Пастанова. Урад вызначыў стаўкі аўтарскага ўзнагароджання за выкарыстанне музычных твораў пры іх перадачы ў эфір. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 13 ліпеня 2019 года № 461, якая афіцыйна апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Стаўкі аўтарскага ўзнагароджання за выкарыстанне музычных твораў шляхам перадачы ў эфір, па кабелі і іншым спосабам для ўсеагульнага азнаямлення складуць 1 працэнт ад даходу, які атрымлівае карыстальнік. Згодна з законам аб аўтарскім праве, памер узнагароджання не можа быць ніжэйшы за мінімальныя стаўкі, устаноўленыя Саветам Міністраў. Акрамя таго, абноўлены склад камісіі па дзяржаўнай акрэдытацыі арганізацый па калектыўным кіраванні маёмаснымі правамі. У яго ўключаны прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры, творчых саюзаў краіны.

Навука. Студэнты-гісторыкі БДУ знайшлі на месцы старажытнага гарадзішча артэфакты I—IV стагоддзяў, паведамілі ў прэс-службе Белдзяржуніверсітэта. Археалагічныя раскопкі вядуцца на гарадзішчы ў вёсцы Цясты Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці. Раскоп на плошчы 80 кв.м даў магчымасць знайсці прадметы, якія адлюстроўваюць бытавую культуру плямён балтаў. Сярод знаходак — рыбалоўныя кручкі, нажы, шылы, сякеры, прасніца, прадметы ўзбраення, вялікая колькасць керамікі. Падчас раскопак знойдзена ўжо каля 5 тысяч артэфактаў. Работай студэнтаў кіруюць старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін БДУ Паліна Курловіч, выкладчык той жа кафедры Уладзімір Плавінскі і дацэнт кафедры крыніцазнаўства Вольга Ліпніцкая.

Праект. Міжнародны музычны фестываль «Вялікая бард-рыбалка», які пройдзе 26—28 ліпеня ў п.Грудзічына на Магілёўшчыне, запускае новы праект — «Паэтычныя майстэрні» ад Міжнароднай літаратурнай прэміі «Антонаўка 40+», паведамілі ў аргкамітэце творчага праекта. Іх будуць праводзіць члены аргкамітэта і журы прэміі «Антонаўка 40+» — літаратары Вольга Анікіна і Дзмітрый Лягеза (Санкт-Пецярбург), Ірына Карэніна і Алесь Емяльянаў-Шыловіч (Мінск). Падчас майстэрняў удзельнікі будуць чытаць свае творы і атрымаюць кансультацыю літаратараў. Кіраўнікі майстар-класаў маюць права адабраць аднаго-трох аўтараў, якія потым возьмуць удзел у вячэрняй канцэртнай праграме. Фіналістаў узнагародзяць спецыяльнымі дыпломамі і памятнымі сувенірамі.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Гонар. Быкаў

Не так даўно мы адзначалі 95-годдзе з дня нараджэння выдатнага творцы, народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Яго жыццё і дзейнасць звязаны з многімі рэгіёнамі. Віцебшчына, дзе творца нарадзіўся, Гродна, дзе ён пэўны час жыў і працаваў, Мінск, дзе правёў большую частку сталага жыцця.

І хоць у справе ўшанавання памяці творцы робяцца новыя і новыя крокі, усё яшчэ актуальнымі для органаў улады і пісьменніцкай грамадскасці застаюцца некалькі важных аспектаў: назваць адну з вуліц сталіцы ў гонар Васіля Быкава, а таксама ўстанавіць тут помнік выдатнаму пісьменніку. Дарэчы, у СПБ ужо прайшло абмеркаванне некалькіх магчымых эскізаў будучага помніка.

А не так даўно да старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца звярнуўся старшыня рады Віцебскай абласной арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Юрый Бабіч. Ён распавёў, што таварыства разам з Віцебскай абласной бібліятэкай правялі вечар-ушанаванне пісьменніка, падчас якога са шкадаваннем адзначылі, што і ў Віцебску ніводная культурна-асветніцкая ўстанова, вуліца ці плошча не носіць імя слыннага літаратара-земляка. Няма і помніка Васілю Быкаву.

Мікалай Чаргінец у сваю чаргу адзначыў, што Васіль Быкаў — гэта наш гонар. На яго творах вучацца ў школе, яго чытаюць, перакладаюць ва ўсім свеце. Таму скіраваў ліст на адрас Віцебскага аблвыканкама з просьбай больш уважліва ставіцца да ацэнкі ролі літаратараў Віцебшчыны ў гісторыка-культурным развіцці рэгіёна, ушанаваць іх памяць. І зрабіць гэта варта ў першую чаргу ў адносінах да Васіля Быкава. У лісце выказваецца спадзяванне, што голас шырокай грамадскасці будзе пачуты і да 75-годдзя Вялікай Перамогі імя пісьменніка-франтавіка Васіля Быкава атрымае годную ацэнку як у сталіцы, так і на роднай яму Віцебшчыне.

Марыя ЛІПЕНЬ

Юныя чытальнікі на прэстыжным форуме

Пераможцы конкурсу чытальнікаў паэзіі Беларусі, праведзенага Мінскім гарадскім аддзяленнем СПБ, бралі ўдзел у «Славянскім базары» на адной з цэнтральных пляцовак. Паездка на гэтае свята адбылася дзякуючы падтрымцы Асацыяцыі абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд».

Каб паспяхова выступіць на прэстыжным форуме, юныя чытальнікі рыхтаваліся загадзя. Рэпетыцыі праводзіла мастацкі кіраўнік Мінскага гарадскога тэатра паэзіі Вольга Багушыньска. А ўдзельнічалі ў свяце вучні гімназіі № 35 Меланія Якімава і Уладзіслаў Салавей, сярэдняй школы № 146 — Соф'я Гарошка, сярэдняй школы № 200 — Мілана Вайшняровіч і выхаванец дзіцячага сада № 499 Роберт Багушыньскі. У іх выкананні прагучалі вершы як класікаў, так і сучасных беларускіх паэтаў.

Горача вітала віцебская публіка Вольгу Багушыньску, якая прадставіла слухачам урывак з паэмы Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра» і верш Максіма Багдановіча «Слуцкія ткачыхі». А юная артыстка-чытальніца лаўрэат многіх творчых конкурсаў Маргарыта Чопка з Брэста ўразіла слухачоў выкананнем верша Міхася Пазнякова «Беларусі».

На свяце былі агучаны і ўзнагароджаны лепшыя маладзёжныя брэнды нашай краіны. Сярод ганаровых гасцей свята быў і старшыня МГА СПБ Міхась Пазнякоў.

Павел КУЗЬМІЧ

Пераклад — як мост

Напярэдадні Дня Незалежнасці і 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у аграгарадку Парэчча, што на мяжы з Літвой, адбылася цікавая літаратурная імпрэза. Тут, у санаторыі, адпачываў вядомы азербайджанскі пісьменнік Камран Назірлі, член Саюза пісьменнікаў Азербайджана, Саюза пісьменнікаў Беларусі, журналіст, перакладчык на азербайджанскую і англійскую мовы, аўтар шматлікіх кніг.

Гродзенскія пісьменнікі запланавалі правесці традыцыйную грамадска-літаратурную акцыю «Пад мірным небам Беларусі» ў маляўнічым памежным мястэчку задоўга да прыезду Камрана Назірлі. Аб прыездзе калегі з Азербайджана стала вядома пазней. Знаёмства з ім — збег прыемных акалічнасцей і добры знак, бо знаёмства, відаць па ўсім, перарасце ў сапраўднае сяброўства.

Камран Назірлі — аўтар шматлікіх празаічных твораў, вядомы далёка за межамі сваёй радзімы. Асаблівае месца ў яго творчасці займае мастацкі пераклад. З-пад пяра госця выйшлі пераклады на азербайджанскую мову твораў такіх беларускіх аўтараў, як Алесь Карлюкевіч, Мікалай Чаргінец, Алесь Бадак, Святлана Алексіевіч, Георгій Марчук, Анатоль Мацвіенка, Таццяна Сівец, Юлія Алейчанка. Усе пераклады выдадзены ў Азербайджане асобнымі кнігамі.

Азербайджанскі творца лічыць жанр літаратурнага перакладу сімвалічным мостам, што злучае народы і культуры, дапамагае разумець людзей, якія жывуць у розных кутках зямлі. Невыпадкова ў цэнтры ўвагі пісьменніка — тэма духоўнасці. Як асветнік і філосаф Камран занепакоены будучыняй чалавецтва. Яго хвалюе зніжэнне цікавасці да літаратуры і творчасці пад уплывам высокіх тэхналогій. «У гэтых пераменах вельмі небяспечна страціць галоўнае — тое, што ва ўсе часы дапамагае чалавеку адчуваць сваю душу, сувязь з прыродай, з нацыянальнымі каранямі — чалавечую існасць», — адзначыў пісьменнік. Пацвярджэннем гэтых слоў сталі яго кнігі: «Пах снегу», «Калі чайкі ўюць гнёзды», «Шчаслівыя птушкі» на рускай і англійскай мовах, прэзентацыя якіх адбылася падчас творчага вечара ў Парэччы.

Асветніцкай місіі літаратуры пісьменнік надае вялікае значэнне, як гэта было завешчана класікамі. 2019 год у Азербайджане аб'яўлены Годам выбітнага азербайджанскага пісьменніка і мысляра Імадэддзіна Насімі (1369—1417). Да 650-годдзя з дня яго нараджэння Камран Назірлі праводзіць сустрэчы з грамадскасцю, чытае лекцыі. Падчас імпрэзы адбыўся прагляд фрагмента мастацкага фільма пра Насімі, які аддаў жыццё за свае перакананні. Камран Назірлі захапляецца і постаццю Францыска Скарыны, прысвяціў яму артыкул.

Прысвечаную Дню Незалежнасці і 75-годдзю вызвалення Беларусі праграму паэтаў Гродзеншчыны склалі творы грамадзянскай лірыкі. Да аматараў літаратуры з розных куткоў Беларусі, а таксама з Літвы і Расіі, звярнуліся Людміла Кебіч, Браніслаў Ермашкевіч, Мікалай Іваноўскі, Людміла Шаўчэнка, Анатоль Апанасевіч і аўтар гэтых радкоў. На ўспамін аб сустрэчы айчынныя літаратары і госць з Азербайджана абмяняліся ўласнымі кнігамі. Чароўнае святло творчасці і сяброўства яшчэ больш зблізіла Азербайджан і Беларусь.

Дзмітрый РАДЗІВОНЧЫК

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***19 ліпеня** — на вечар памяці Анатоля Шушко ў Пінскую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Янішчыц (14.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

***20 ліпеня** — на сустрэчу Наталлі Ніканчук «Па старонках дзіцячых твораў пісьменніцы» з выхаванцамі дзіцячага летняга лагера ў гімназіі № 1 г. Горкі (11.00).*

***24 ліпеня** — на літаратурна-патрыятычную гадзіну «Памяці вечнай дастойныя» з удзелам Міколы Леўчанкі ў межах раённай патрыятычнай акцыі «Героям лепшая ўзнагарода, што ў кнігах памяць пра іх ёсць» у Быхаўскую цэнтральную раённую бібліятэку (11.00).*

Заставацца беларусамі

Частка экспазіцыі прысвечана так званаму пакаленню DP — гэта беларускія эмігранты-інтэлектуалы, якія ў 1940-х гадах апынуліся ў лагерах *displaced persons* на германскай тэрыторыі (адкуль потым пераехалі ў многія іншыя краіны). Яны разумелі: у вялікім свеце беларусамі можна застацца толькі трымаючыся роднага слова, роднай культуры. Паэтычным сімвалам яны выбралі кветку шыпшыны, і ў гэтым — глыбокі сэнс. Дзікая расліна, яна не даецца ў рукі чужынцу, сустракаючы яго калючымі дзідамі, але цвіце пышна і прыгожа, а чырвонымі пладамі сведчыць аб сваёй неўміручасці. «Шыпшынай» называўся літаратурны альманах, які выдаваўся ў тыя гады (па сведчанні Лідзіі Савік выйшла ўсяго 10 нумароў). Адметна, што сродкі на выданне літаратары-эмігранты ні ў кога не прасілі — гэта былі грошы, якія яны зарабілі на будаўніцтве дарог

Калаж Кастуся Дробава.

Друкаваныя выданні беларусаў замежжа 1940—1950-х гадоў.

ды іншых работах. Пад шклом вітрыны прадстаўлены аркуш з подпісамі аўтараў і сумамі ахвяраванняў на друкаванне часопіса. Скідваліся, хто колькі мог: нехта выдзеліў адзін долар, нехта — пяць. Выходзілі і газеты, дзе друкаваліся звесткі аб жыцці беларусаў у розных кутках свету. Былі і нелітаратурныя выданні, напрыклад, парады ад лекараў: як весці здаровы лад жыцця. Нямала было і букваро́ў, дзіцячых чытанак на роднай мове: каб у шматмоўным свеце дзеткі-беларусы атаясамлівалі сябе са сваёй Радзімай, хай сабе і не паспеўшы пакуль яе пабачыць...

— Мы прадставілі апошнія паступленні ў фонды музея: гэта выданні, перададзеныя таварыствам па сувязях з суайчыннікамі за мяжой «Радзіма» (яны адлюстроўваюць беларуска-ўкраінскія, беларуска-малдаўскія, беларуска-эстонскія сувязі, а таксама беларуска-канадскія ды іншыя). Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» перадала ў фонды кнігі з серыі «Бібліятэка Бацькаўшчыны», прысвечаныя беларускай эміграцыі. Акцэнт зрабілі на друкаваных выданнях: як яны выходзілі за мяжой і што сабой уяўлялі (паштоўкі, дзіцячыя кніжкі, буквары, літаратурныя альманахі), — распавяла куратар выстаўкі Святлана Кажамяка.

Фота Кастуся Дробава.

Абраз Божай Маці, вернуты на Радзіму.

Каб моладзь у эміграцыі асяродку не згубілася ў свеце, шмат выдавалася паштовак са здымкамі знакамітых беларусаў, напрыклад, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча.

Нам, беларусам, трэба адкрываць для сябе іншых беларусаў — тых, якія з'ехалі і былі забыты, — перакананы кансультанты, якія спрычыніліся да адкрыцця выстаўкі, — Наталля Гардзіенка і Адам Мальдзіс.

Адкрыццё выстаўкі было прымеркавана да V пасяджэння Кансультатыўнага савета пры Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь па справах беларусаў замежжа. Вынікам ранейшых пасяджэнняў стала прыняцце Закона аб беларусах замежжа. У музея свае надзеі на выстаўку. Годам раней дырэктар установы Міхаіл Рыбакоў ініцыіраваў праект па збіранні і вяртанні на Беларусь каштоўнасцей з гісторыі беларускай літаратуры. Нягледзячы на адносна невялікі прамежак часу, праект паспеў прынесці плён: у фонды музея пачалі паступаць выданні, асабістыя рэчы пісьменнікаў, творы мастацтва ад арганізацый і прыватных асоб.

Нядаўна Святлана Яськова, актывістка беларускай дыяспары ў Іспаніі, дырэктар Кансультатыўна-моўнага цэнтра «Лінгваландыя», перадала ў музей каштоўны абраз Божай Маці з немаўляткам Ісусам на руках. Невялікага памеру (аклад крыху пацямнеў ад часу), датуецца прыблізна XIX стагоддзем, яўна ручной работы. Яшчэ ў гады Вялікай Айчыннай беларуская сям'я бежанцаў, якая апынулася ў Іспаніі, мела яго з сабой як найвялікшую каштоўнасць. Нашчадкі ж зразумелі, што абраз жадае вярнуцца, таму і вырашылі падарыць яго музею з добрым пажаданнем: няхай Божая Маці засцерагае беларусаў на Радзіме!

Яна БУДОВІЧ

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

супрацоўніцтва

Нашы вішні зацвілі ў Сербіі

Паэзію беларускага паэта Сяргея Панізніка (нарадзіўся ў 1942 годзе) добра ведаюць у Латвіі, Украіне, Расіі, Чэхіі, Славакіі. Яго творы перакладзены на мовы самых розных народаў свету. Новая кніга паэзіі нашага суайчынніка — «Вішні цвітуць» — выйшла сёлета ў Сербіі.

Бялградскі зборнік беларускага паэта пераклала на сербскую вядомая перакладчыца Даяна Лазарэвіч. Наклад кнігі, якую выдаў паэт і кіраўнік Саюза паэтычных стваральнікаў Сербіі Анджэла Заблачанскі, — 300 асобнікаў. Даяна Лазарэвіч — перакладчыца твораў беларускіх паэтаў Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча, Алеся Бачылы, Віктара Кажуры і іншых. Пісьменніца часта бывае ў Беларусі, займаецца бібліяграфіяй публікацый, якія адлюстроўваюць беларуска-сербскія літаратурныя сувязі.

У кнізе «Вішні цвітуць» Сяргея Панізніка змешчаны творчыя біяграфіі аўтара зборніка і перакладчыцы. Уступнае слова пра паэзію беларускага творцы напісала Даяна Лазарэвіч. Вокладку зборніка ўпрыгожвае фотапартрэт аўтара, які ў канцы 60-х гадоў зрабіў Іван Мележ.

Сяргей ШЫЧКО

ЛіМ КАЛЯНДАР

20 ліпеня — 135 гадоў з дня нараджэння Яўгена Віцінга (1884—1959), спевака, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў Латвіі і БССР.

20 ліпеня — 95 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Анічэнкі (1924—2001), мовазнаўца, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь.

20 ліпеня — 95 гадоў з дня нараджэння Міколы (Мікалая) Лук'янава (1924—2004), празаіка, заслужанага работніка сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

21 ліпеня — 90 гадоў з дня нараджэння Віктара Каваленкі (1929—2001), літаратуразнаўца, крытыка, празаіка, заслужанага дзеяча навукі БССР.

21 ліпеня — 90 гадоў з дня нараджэння Альбіны Сцяпанавай (1929—2017), мовазнаўца, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь.

21 ліпеня 70 гадоў спаўняецца Фёдару Балабайку, танцоўшчыку, заслужанаму артысту Рэспублікі Беларусь.

21 ліпеня 70-годдзе адзначае Сяргей Пясцехін, артыст балета, педагог, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь.

22 ліпеня — 100 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Булахава (1919—2012), мовазнаўца, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь.

22 ліпеня 85-гадовы юбілей святкуе Барыс Барысёнак, акцёр, педагог, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь.

22 ліпеня — 85 гадоў з дня нараджэння Валянціна Давыдава (1934—2015), артыста балета, народнага артыста Беларусі.

22 ліпеня 85 гадоў спаўняецца Ларысе Салавей, мастацтвазнаўцы, заслужанаму настаўніку Рэспублікі Беларусь.

23 ліпеня — 80 гадоў з дня нараджэння Анатоля Кірвеля (1939—2008), пісьменніка.

23 ліпеня 75-годдзе адзначае Ніна Дзьячэнка, артыстка балета, балетмайстар, педагог, заслужаная артыстка РСФСР.

24 ліпеня — 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіслава Нядзведскага (1929—1973), паэта, празаіка.

24 ліпеня — 85 гадоў з дня нараджэння Генадзя Гарбука (1934—2018), народнага артыста Беларусі.

24 ліпеня 75-гадовы юбілей святкуе Ніна Фральцова, мастацтвазнаўца.

25 ліпеня — 80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Хмызнікава (1939—1992), скульптара, графіка.

люстэрка тыдня

У Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі адкрыецца фотавыстаўка «Спітакская трагедыя: рэтраспектыва памяці». Яна прысвечана 30-годдзю землетрасення ў Арменіі, якое забрала жыцці 25 тысяч чалавек. Будуць прадстаўлены больш як 30 работ фотарэпарцёраў інфармацыйных агенцтваў «Арменпрэс» і БелТА. Здымкі былі зроблены ў дні спітакскай трагедыі, якая адбылася зімой 1988 года. На боль Арменіі адгукнуліся рэспублікі Савецкага Саюза і 113 краін свету, мноства міжнародных гуманітарных арганізацый і прыватных асоб. Армянскаму народу працягнулі руку дапамогі і беларусы, якія з першага дня трагедыі ўдзельнічалі ў выратавальных і аднаўленчых работах. Выстаўка арганізуецца пры ўдзеле Пасольства Арменіі ў Беларусі.

Беларускія маладыя музыканты Настасся Міхнавец і Міраслаў Батальёнак заваявалі «серабро» і «бронзу» на фестывалі рускай класічнай музыкі Kustendorf classic, які праходзіў у Сербіі, паведамляе БелТА. Навучэнцы музычных школ і акадэмій з Расіі, Сербіі і Беларусі змагаліся ў майстэрстве выканання рускай класічнай музыкі. Беларускія артысты прадэманстравалі найвышэйшы ўзровень выканальніцкага майстэрства. Конкурс праводзілі ў вёсцы Дрвенград або Кустэндорф, якую арганізатар гэтага конкурсу сербскі рэжысёр і музыкант Эмір Кустурыца пабудаваў для здымак фільма «Жыццё як цуд» (2004).

У Іванаве Брэсцкай вобласці ў найбліжэйшы час адновяць пашкоджаны падчас урагану помнік Напалеону Ордзе, інфармуе БелТА. Унікальная кампазіцыя, дзе творца сядзіць з мальбертам у руках і глядзіць удалячынь, усталявана ў Іванаве ў 1997 годзе. Бронзавая скульптура мастака і кампазітара была пашкоджана ўвечары 1 ліпеня. Як паведамілі ў райвыканкаме, аднаўленчыя работы абмяркоўваліся з аўтарам скульптурнай кампазіцыі Ігарам Голубевым. У выніку помнік Напалеону Ордзе набудзе свой першапачатковы выгляд.

На Міншчыне, у Капыльскім раёне, на адным з палёў з'явіўся 300-метровы малюнак скрыпічнага ключа. Такім незвычайным спосабам кампанія *velcom|A1* вырашыла прыцягнуць увагу гледачоў да мінскіх канцэртаў фестывалю «Класіка ў Ратушы з *velcom|A1*», які праводзіцца пяты раз. На першым з шасці запланаваных мінскіх канцэртаў юбілейнага сезона Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Аляксандра Анісімава прадоўжыць традыцыю і адкрые новы цыкл класічных канцэртаў пад адкрытым небам мінскай Ратушы. У гонар юбілею фэсту канцэрты праходзяць адразу ў пяці абласных гарадах Беларусі. Мінская ж серыя «класічных субот» будзе радаваць сваіх прыхільнікаў аж да 31 жніўня.

Аўтар цыкла «Песня лёду і полымя» (*A Song of Ice and Fire*), сучасны амерыканскі пісьменнік-фантаст, сцэнарыст, прадзюсар і рэдактар, лаўрэат шматлікіх літаратурных прэмій Джордж Марцін не дазволіць прыхільнікам экранізацыі яго твораў — тэлесерыяла «Гульня тронаў» (*Game of Thrones*) — дыктаваць, як завяршыць яго раманы, заявіў пісьменнік у інтэрв'ю часопісу *Entertainment Weekly*. Ён прызнаўся, што адчувае палёгку ад таго, што пасля фіналу «Гульні тронаў» ніхто больш не прымушае яго завяршаць чарговы раман да пачатку здымак новага сезона серыяла, паведамляе ТАСС. «Шоу скончылася. Я пішу кнігу, якая будзе скончана тады, калі будзе скончана», — рэзюмаваў пісьменнік.

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

Вялікая пляцоўка для захавання адзінства

СІМВАЛІЧНАЯ ЗОРКА НА АЛЕІ СЛАВЫ

Фестываль, на якім за амаль тры дзясяткі гадоў вырасла цэлае пакаленне, безумоўна, мае свае традыцыі. Адна з іх — у дзень адкрыцця ўшаноўваць артыстаў, чыя творчасць злучае сэрцы, народы і дзяржавы. На плошчы зорак каля Летняга амфітэатра прарос імянны «васілёк» народнай артысткі Украіны Таісіі Павалій. Асабістая пліта на галоўнай фестывальнай алеі — прыемны дадатак да спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Беларусі «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення».

Выступленне Ксеніі Галецкай (Беларусь) на дзіцячым вакальным конкурсе «Віцебск-2019».

— Віцебск — мая творчая радзіма. І таму неверагодна прыемна адчуваць такую ўвагу да сябе, — адзначыла Таісія Павалій. — Увогуле, Беларусь умее зачароўваць цеплынёй, гасціннасцю. Тут публіка добрая, яна не ганьбіць, а чакае цябе. У наш час такое стаўленне не заўсёды сустрэнеш. Таксама мне хацелася б падкрэсліць, што ў Беларусі, у прыватнасці ў Віцебску, шануюць і ганарацца нацыянальнай культурай і традыцыямі. Так прыемна: гуляеш па горадзе, а вакол гучаць беларускія песні, дзяўчаты і хлопцы апрануты ў нацыянальныя строі. Здаецца, што дробязі, але не. Менавіта дзякуючы такім маленькім дэталям, ваша культура мацнее і прыцягвае ўсіх тых, хто мае магчымасць да яе дакрануцца.

Таісія Павалій прыязджае на «Славянскі базар» амаль кожны год, яна адзначае ўсе перамены ў лепшы бок і ўважліва сочыць за конкурсам. На яе думку, узровень маладых выканаўцаў на фестывалі заўсёды вельмі высокі. Спявачка выказвае такое меркаванне з веданнем справы: у 2010 годзе сама ўзначальвала журы конкурсу. А яшчэ артыстка прызналася, што плануе праграму ў гонар свайго 55-годдзя (прадставіць у канцы 2019 года) прывезці ў Віцебск на 29-ты «Славянскі базар».

ДЗІЦЯЧЫМІ ГАЛАСАМІ

Адным з самых важных мерапрыемстваў, якія адбываюцца ў межах «Славянскага базару», з'яўляецца дзіцячы міжнародны вакальны конкурс. Штогод прадстаўнікі розных краін рыхтуюцца да яго з вялікай адказнасцю. Усё ж такі ў гэтым выпадку ўдзельнікі прэзентуюць не толькі вакальныя і сцэнічныя здольнасці, а прадстаўляюць сваю краіну на міжнароднай пляцоўцы.

Сёлета канкурэнцыя была вялікая. На сцэну Летняга амфітэатра выйшлі прадстаўнікі дваццаць адной краіны. Пераможцу конкурсу назвалі не адразу. Інтрыгу трымалі да апошняга. Перамогу і галоўны прыз — Гран-пры і «Залатую ліру» — атрымала канкурсантка з Беларусі Ксенія Галецкая, якая ў першы дзень выканала песню на роднай мове «Грай», а ў другі конкурсны дзень зачаравала гледачоў і журы арыгінальным выкананнем *Back in the U.S.S.R.* з рэпертуару *The Beatles*.

Першую прэмію прысудзілі Анжэле Алберцян з Арменіі. Другую падзялілі Артур з Украіны і Анастасія Барбэ з Малдовы. Трэцюю прэмію таксама атрымалі адразу дзве канкурсанткі — прадстаўніца Грузіі Аннушка і ўдзельніца з Расіі Кіра Гагаладзэ.

Іншыя ўдзельнікі дзіцячага конкурсу таксама не ў крыўдзе. Адны атрымалі тыднёвую пуцёўку на Мальту, іншыя — паездкі на музычныя фестывалі ў Рыгу і Вялікабрытанію, трэція — магчымасць запісаць песні з аранжыроўкай.

— Было і жахліва, і цікава адначасова. Але я літаральна за некалькі секунд да выступлення спрабавала настроіцца і выходзіла на сцэну з пачуццём гордасці за Беларусь, — расказвае Ксенія Галецкая. — Для мяне гэты конкурс асаблівы таму, што ў мяне была магчымасць спець пра нашу краіну, пра нашу цікавую беларускую сям'ю, якая застаецца назаўсёды ў сэрцах тых, хто меў магчымасць хоць раз пабываць у ёй.

Узначальваў журы дзіцячага конкурсу папулярны шведскі музыкант *Bosson*, які прызнаўся, што шмат хто з удзельнікаў — гатовыя артысты, кожны са сваёй харызмай і талентам. Ксенія Галецкая зачапіла журы артыстычнасцю. На працягу двух дзён канкурсантка здзіўляла яркімі сцэнічнымі вобразамі і прадуманай да дробязей праграмай выступленняў.

СКЛАДАНАСЦЬ ВЫБАРУ

А конкурс маладых выканаўцаў на віцебскім фестывалі «Славянскі базар» завяршыўся безумоўнай перамогай Адзільхана Макіна з Казахстана (178 балаў, Гран-пры і 20 тысяч долараў ЗША). А вось Георгій Путкарадзэ з Грузіі і Ілай з Ізраіля набралі балаў пароўну — 171. І паколькі першую прэмію, згодна з палажэннем, дзяліць нельга, Тамара Гвердцытэлі на правах старшыні журы, валодаючы правам дадатковага голасу, аддала яго суайчыннику. І Путкарадзэ стаў лаўрэатам першай прэміі і ўладальнікам узнагароды, грашовай прэміі ў памеры 15 тысяч долараў. Другую прэмію ў памеры 5 тысяч долараў кожнаму і спецпрыз падзялілі Ілай і беларус Ваня Зданюк, якія набралі 170 балаў. Гарачыя спрэчкі вяліся ў экспертаў і адносна трэцяй прэміі. Але ў выніку лаўрэатамі названы расіянін Іван Дзятлаў з 168 баламі і ўкраінец Дзмітрый Бабак. Яны падзялілі і спецыяльны прыз, і прэмію ў 5 тысяч долараў.

— Адзільхан Макін — бясспрэчны і відавочны лідар — і па балах, і па адчуваннях, — падкрэсліла Тамара Гвердцытэлі. — У Казахстане, я ведаю, умеюць падтрымліваць музычныя таленты. Тым больш што хлопец вельмі моцна трымаецца на сцэне. Для артыста вельмі важна быць візуальна запамінальным. Гэты аспект спрыяе далейшаму развіццю, ён дазваляе творцу рухацца наперад. Але ж хацелася б падкрэсліць, што ўзровень усіх канкурсантаў вельмі моцны. Прыемна, што ўдзельнікі ставяцца да гэтай справы з пачуццём адказнасці.

ПОШУКІ БАЛАНСУ

«Славянскі базар у Віцебску» — гэта не толькі канцэрты, выступленні артыстаў вулічных тэатраў, народная творчасць і прагулкі па горадзе майстроў. Яшчэ

Падчас медыясесіі «Саюзная дзяржава: як перадаць моладзі наш культурны код» у музеі-сядзібе «Здраўнёва».

адна традыцыйная «цаглінка» ў падмурку фестывальнай праграмы — круглы стол, прысвечаны праблемам культуры і мастацтва. Сёлета журналісты і дзеячы культуры паспрабавалі знайсці баланс паміж забаўляльным і сур'ёзным. Мадэратарам круглага стала выступіў дырэктар Выдавецкага дома «Звязда» Павел Сухарукаў.

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел кіраўнікі і прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, арганізацый сферы культуры, рэспубліканскіх і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі, дзеячы культуры і мастацтва. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі пытанні стану культуры і мастацтва на сучасным этапе, падкрэслілі іх ролю ў развіцці духоўнага і маральнага патэнцыялу народаў і пакаленняў, а таксама абмяняліся меркаваннямі наконт месца форуму ў сусветнай культурнай прасторы. Гарачыя дыскусіі і разнастайныя меркаванні не пакінулі абыякавымі прадстаўнікоў СМІ.

Так, генеральны дырэктар Беларускага інфармацыйнага агенцтва БелТА Ірына Акуловіч падчас круглага стала падкрэсліла, што пытанні развіцця культуры і мастацтва залежаць ад падачы гэтай тэмы сродкамі масавай інфармацыі:

— Ад нас, журналістаў, залежыць, колькі літар, лічбаў, эмоцый, фота і відэа мы ўкладзём у матэрыялы па тэме культуры і мастацтва. Разам з тым нельга слепа ісці за меркаваннем. Мы самі павінны фарміраваць яго, шукаць новыя цікавыя фарматы падачы інфармацыі, каб гэтыя тэмы траплялі ў рэйтынг. Калі людзі будуць бачыць інфармацыю, то і цікавіцца будуць.

А старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца прапанаваў грунтоўна разабрацца ў пытаннях сучаснасці і актуальнасці мастацкіх кірункаў фестывалю. Ён падкрэсліў, што ўсе ўдзельнікі фестываляў павінны быць сучаснымі, інакш народ перастане іх успрымаць. Таксама Рыгор Сямёнавіч заўважыў, што дзякуючы шматгадоваму ўдзелу мастакоў у «Славянскім базары», Беларускі саюз мастакоў можа вызначыць, якіх менавіта форм ад выяўленчага мастацтва патрабуе цяперашні час. Без крытыкі таксама не абышлося. Рыгор Сітніца заўважыў, што ў межах фестывалю не хапае класічных форм мастацтва, таго ж джазу ці проста оперы:

— Мне б хацелася, каб гэтае пытанне было дэталёва разгледжана. У славянскіх краінах ёсць што паказаць і пра што сказаць. Безумоўна, «Славянскі базар» нельга абвінаваціць у тым, што тут толькі папсовае мастацтва. Але ж класічнага хацелася б больш, таму я ўношу прапанову — падумаць над цікавымі формамі папулярызацыі розных кірункаў мастацтва.

Намеснік старшыні Беларускага саюза пісьменнікаў Алена Стэльмах звярнула ўвагу на тое, што «Славянскі базар» дае магчымасць не толькі развівацца мастацкім кірункам, але і дапамагае быць пачутымі пісьменніцкай супольнасці. І паколькі творчыя сілы яшчэ рэалізаваны ў межах фестывалю не ў поўнай меры, то ёсць нагода падумаць, як зрабіць так, каб літаратура была прадстаўлена больш шырока ў наступныя гады.

САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА ЗАПРАШАЕ

«Славянскі базар у Віцебску» даўно стаў святам дружбы брацкіх народаў Беларусі і Расіі. Пра гэта сведчыць Дзень Саюзнай дзяржавы, які па традыцыі прайшоў у рамках форуму. Сёлета ён ахапіў дзве важныя даты: 20-годдзе стварэння Саюзнай дзяржавы і 50-годдзе беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры».

Дзень Саюзнай дзяржавы ў фестывальным Віцебску адкрыла цырымонія ўскладання кветак да Вечнага агню на Мемарыяльным комплексе ў гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў, ветэранаў і падпольшчыкаў. Пасля ў Мастацкім музеі гасцям былі прадстаўлены выстаўка «Растоўская фініфць» — мініяцюрнага жывапісу на эмалі, які лічыцца адной з самых старажытных з'яў у мастацтве ўсходніх славян, і экспазіцыя, прысвечаная Аляксандру Неўскаму.

12 ліпеня ўпершыню ў Віцебск прыбыў шэдэўр ювелірнага мастацтва — рэпліка Вялікай імператарскай кароны, якая тут знаходзілася ўсяго адзін дзень. Сёння арыгінал з'яўляецца галоўным экспанатам Дыяментавага фонду Музеяў Маскоўскага Крамля і ніколі не пакідае скарбніцу. Да 250-годдзя шэдэўра ў 2012 годзе ювелірная група «Смаленскія брыльянты» стварыла яго рэпліку. Яна выканана з белага золата, абсыпана брыльянтамі і буйнымі марскімі жамчужынамі. У цэнтры абруча карону увенчвае вялікі брыльянт масай 10,11 карата. Аналагаў гэтага твора ў свеце не існуе.

Традыцыйна ў межах Дня Саюзнай дзяржавы прайшла медыясесія ў музеі-сядзібе «Здраўнёва», якая сёлета была прысвечана 175-годдзю з дня нараджэння Ільі Рэпіна і абмеркаванню тэмы культурнага кода абедзвюх краін і яго пераемнасці наступнымі пакаленнямі. Традыцыйна ў медыясесіі прыняў удзел Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота, які падкрэсліў неабходнасць стварэння разнастайных адукацыйных праграм для папулярызацыі культурных кірункаў сярод моладзі.

Завяршылася праграма Дня Саюзнай дзяржавы на XXVIII Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ў Летнім амфітэатры канцэртам «Саюзная дзяржава запрашае...», на якім Рыгор Рапота павіншаваў ансамбль «Песняры» з 50-годдзем.

Рыгор Рапота ўручае дыплом лаўрэата Беларускаму дзяржаўнаму ансамблю «Песняры».

Сёлета «Славянскі базар» запомніўся не толькі музычнымі мерапрыемствамі, але і шырокай забаўляльнай праграмай. Лялечны квартал, выстаўкі майстроў-рамеснікаў, выступленне кавер-бэндаў, арыгінальныя перфомансы… Усё гэта спрыяла таму, каб кожны чалавек, які ў гэтыя дні апынуўся ў Віцебску, змог адчуць атмасферу сапраўднага свята.

Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Навуковец, які верыць...

Знакаміты літаратуразнаўца, які праклаў новыя напрамкі ў тэорыі прозы, вершазнаўства на сумежжы з лінгвістыкай, фалькларыстыкай, этнаграфіяй, Алесь Яскевіч спалучаў навуковы падыход з яркай дзейнасцю літаратурнага крытыка, паставіўшы мэтай не абысці ўвагай ніводнага пісьменніка, асабліва з маладых. Яго ацэнкі чакалі і сталыя аўтары.

Помніцца яго абарона Уладзіміра Караткевіча, якога тады моцна крытыкавалі за тое, што ў творах шмат нацыянальнага, а таксама Пімена Панчанкі, пазней народнага дэпутата, за яго вострасацыяльны знакаміты твор «Прыстасаванцы».

Алесь Яскевіч асмеліўся ўжо тады аб'ектыўна напісаць пра мастацкія вартасці аповесці Аляксея Кулакоўскага «Дабрасельцы», якую ў той час ганілі.

Артыкулы, нават простыя рэцэнзіі, вылучаліся навізной, цанілася тым, што ён пісаў пра твор не толькі з боку маральна-ідэйнага зместу, а звяртаў увагу на надзвычай патрэбную тады культуру творчасці. Карысталася папулярнасцю яго першая кніга «Карані маладога дрэва», якой захапіліся фалькларысты (раздзел «Ад казкі — да апавядання»), мастакі, скульптары, архітэктары (раздзел «Каненкавы, Якубонісы, Немееры... Ці будуць яны ў нас»).

Аўтар распрацоўваў напрамак у літаратуразнаўстве, які асвятляў творы з гледзішча нацыянальных традыцый, ім была канцэптуальна па-новаму пераасэнсавана ранняя беларуская літаратура: спадчына Яна Баршчэўскага, Яна Чачота, Уладзіслава Сыракомлі, Вінцэся Каратынскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Францішка Багушевіча, Янкі Лучыны.

Наступная кніга Алеся Яскевіча — фундаментальнае даследаванне «Станаўленне беларускай мастацкай традыцыі». Пазней гэтую тэму ён абараніў у якасці доктарскай. Даследаванне па-новаму адкрывала для айчыннага чытача постаці ад Яна Баршчэўскага, Яна Чачота да Янкі Лучыны, — яны



прызнаваліся «першапачынальнікамі» беларускага пісьменства, на фальклорна-мастацкіх распрацоўках якіх узрастала наша знакамітая класіка.

Кніга, заснаваная на псіхалогіі творчасці, — «У свеце мастацкага твора», асабліва спадабалася выкладчыкам, яе залічылі ў «літаратуразнаўчую класіку».

Гэтая праца знакамітая тым, што знаходзіцца на сумежжы літаратуры і мовы. Поглядам літаратуразнаўцы аўтар ацэньваў асаблівую, прыкметную больш знешне эпічнасць беларускага слова, якое да той пары не было ацэнена ў сваёй вобразнай «унутранай форме».

Трэба адзначыць унёсак даследчыка ў распрацоўку функцыянальных стыляў беларускай мовы.

Помніцца яго фактычнае адзінаборства з запатрабаваннем рэфармавання беларускага правапісу па ўзоры «Граматыкі» Браніслава Тарашкевіча. Алесь Сямёнавіч, узначаліўшы моўную камісію пры Саюзе пісьменнікаў, правёў дзве праблемныя канферэнцыі з абмеркаваннем ужо на найвышэйшым узроўні ў Вярхоўным Савеце, камісію якога ачольваў Ніл Гілевіч. Запрасіў шырокае кола мовазнаўцаў і іншых спецыялістаў. У выніку чаго скараспелая тарашкевіцкая рэфармацыя была адвергнута грамадскасцю, становішча нармалізавалася.

Алесь Яскевіч праявіўся і ў галіне мастацкага перакладу. Вядомыя яго публікацыі ў часопісе «Дружба народаў». За артыкулы па перакладзе пісьменнік неаднойчы атрымліваў гадавыя прэміі часопіса.

Этапнай у навуковым станаўленні была кніга «Рытмічная арганізацыя мастацкага тэкста», якую яго старэйшыя калегі — акадэмік І.Я. Навуменка, прафесар, доктар філалагічных навук М.М. Грынчык — адносілі да найважнейшых тэарэтычных распрацовак сусветнай філалогіі.

Сам Алесь Яскевіч лічыць найбольш вартым сваё апошняе выданне «Сусветная таямніца чалавека». Яно стала настольнай кнігай для навукоўцаў і святароў — кнігай роздуму над сённяшнім і будучыняй. Натхнёныя кнігай чытачы казалі, што дзеля яе стварэння і «варта было жыць».

Сярод надрукаваных багаслоўскіх кніг і брашур варта нагадаць «Прырода ў свеце Бібліі», «Біблейскі пераклад: збяражэнне тэксту» (Даклад на XII з'ездзе славістаў), «Літаратура, мова, пераклад», «Роля Бібліі ў станаўленні нацыянальнай літаратурнай мовы» (С-Пб. Калектыўны зборнік сумесна з іншымі аўтарамі).

Заслугай Алеся Яскевіча як біблеіста з'яўляецца абгрунтаванне тэорыі біблейскіх паралельных месцаў як ключа, выяўленне «страчаных», аднаўленне новых. Спецыялізацыя ў астранамічных ведах, у рэчышчы біблейскай астраноміі дазволіла выявіць пагрэшнасці біблейскіх перакладаў, нават выпадзенне кавалкаў біблейскага тэксту ў большасці прынятых Евангельскіх перакладаў многіх хрысціянскіх нацый.

Творчы багаж пісьменніка складаюць каля дзвюх дзясяткаў манаграфій і болей ад сотні (у тым ліку артыкулаў і рэцэнзій) журналісцкіх работ.

Сцяпан ЛАЎШУК

Палёт на надламаных крылах

Чалавек надзвычайнай сілы духу Тамара Лазнюха да гэтага часу любіць восень. Нягледзячы на тое, што менавіта восенню 1980 года кардынальна змянілася яе жыццё. ...Балансаванне на мяжы жыцця і смерці. Прысуд дактароў... Што чакае заўтра?.. Дачушцы толькі дванаццаць, а сыну ўсяго сем. Усе хатнія клопаты з мамчыных плячэй перакладаліся цяпер на іх, дзіцячыя. Дадаўся і догляд мамы, да нядаўняга прыгожай, поўнай сіл, энергічнай.

У міг пасталелыя дзеці разумелі: як раней ужо не будзе ніколі. На бацьку не спадзяваліся, тым больш што неўзабаве пасля трагедыі ён сышоў з сям'і.

Дзеці і маці засталіся сам-насам з бядой. Яна па памяці дыктавала рэцэпты той ці іншай стравы, і з часам дзяўчынка і хлопчык навучыліся прыстойна кашаварыць. Яны ж кармілі яе з лыжкі, прыбіралі ў доме, спраўляліся самастойна з усімі іншымі гаспадарчымі дробязямі, паспяваючы пры гэтым добра вучыцца ў школе, каб радаваць маму высокімі адзнакамі. Рана пасталеўшы, першапачаткова прынялі мудрае рашэнне — быць разам з маці пры любых абставінах. Так сям'я вучылася жыць па-новаму.

Тамара Лазнюха ніколі не наракала на лёс, не задавалася пытаннем: за што? Пакорліва несучы свой крыж, у хвіліны адчайнай адзіноты перагортвала ў памяці старонкі сваёй сціплай біяграфіі. Дзяўчынка з прыгараднай вёскі Дамашыцы, скончыўшы сярэднюю школу ў суседніх Малоткавічах, як і іншыя аднагодкі, перабралася ў горад. Праца на фабрыцы мастацкіх вырабаў падабалася, таму і вучоба, праўда, завочная, у Мінскім тэхналагічным тэхнікуме была ўсвядомленай і паспяховай. Хутчэй за ўсё, была і перспектыва кар'ернага росту. Хуткае замужжа ў васямнаццаць гадоў, сямейнае жыццё, нараджэнне дзяцей, а потым і трагедыя (Тамары было 32 гады) унеслі свае карэктывы.

Але жыццё працягваецца. Вершамі. Першыя нясмелыя спробы былі яшчэ ў школе і забыліся ў мітусні дзён. І толькі праз час словы вырваліся, сталі сэнсам новага жыцця. Падбіраліся, складваліся ў радкі, станавіліся паэтычнымі знаходкамі. Аднак запісаць іх самой не атрымлівалася, і Тамара Пятроўна старалася захаваць знойдзеныя, выпакутаваныя вобразы ў памяці да прыходу дзяцей са школы... За першы год хваробы назбіраўся цэлы сшытак.

Напярэдадні дня нараджэння паэтэсы яе дзеці занеслі ўжо іншы сшытак у рэдакцыю пінскай раённай газеты «Палеская праўда» з надзеяй зрабіць маме сюрпрыз да 45-годдзя. І ў канцы кастрычніка 1993 года верш «Пусть побеждает добро!» быў надрукаваны ў гэтым выданні.

Аднак дэбютам Тамара Пятроўна лічыць публікацыю трох яе вершаў гэтага ж года ў гарадской газеце «Пінскі веснік», якія падрыхтаваў да друку паэт Зіновій Вагер. Не магу не ўспомніць у сувязі з гэтым яшчэ адно імя — паэтэсы Наталлі Прыступы, якой, на жаль, ужо з намі няма. Наталлю і Тамару яднала многае — абедзве родам з адных месцаў, абедзве з юнацтва трапятліва ставіліся да паэзіі. Наталля таксама не магла абыходзіцца без дапамогі іншых, але, як і Тамара, мела добрае сэрца і расхінутую душу. Яна ўсяляк падтрымлівала маладога аўтара, аднак і патрабавала з яе строга як літкансультант, як сапраўдны сябар, які не толькі захапляецца, але і звяртае ўвагу на недахопы.

Гартаю аб'ёмістую чырвоную папку, у якой дзеці і ўнукі, сябры Тамары Пятроўны беражліва сабралі публікацыі пра яе. Іх мноства, аб'яднаных адным пачуццём — захапленнем. Яе мужнасцю, талентам, вялікай верай, невычэрпным жаданнем жыць і гаварыць вершамі пра вечныя каштоўнасці, актуальныя праблемы. Паэзія Тамары Лазнюхі жыццесцвярджальная, аптымістычная, шмат у чым аўтабіяграфічная, але самае галоўнае — высокадухоўная.

Першая кніга вершаў «Цветом рубина» была выдадзена да 50-годдзя паэтэсы, а апошняя пакуль што, адзінаццатая па ліку, «Крылатое предзимье» — да 70-годдзя. Кнігі Тамары Лазнюхі знаходзяцца ў асабістых і грамадскіх бібліятэках 16 краін свету. Шматлікія лісты-рэцэнзіі, водгукі, падзякі ляцяць з розных гарадоў далёкага і блізкага замежжа. Ёсць і навуковыя працы, прысвечаныя жыццю і творчасці Тамары Пятроўны Лазнюхі. Вершы яе друкаваліся ў многіх газетах, часопісах і калектыўных зборніках Мінска, Масквы, Барнаула, Бранска... Лагічным было рашэнне Пінскага гарадскога выканаўчага камітэта сярод іншых заслужаных гараджан удастоіць Тамару Пятроўну ганаровага звання «Чалавек года — 2018» у галіне культуры, мастацтва і духоўнага адраджэння.

Дарэчы, на вершы Тамары Лазнюхі самадзейныя кампазітары напісалі больш за 30 песень. Некаторыя з іх гучаць у праваслаўных храмах Пінска, Віцебска, Моталя. А песняй «Гімн гораду Пінску» завяршаецца звычайна святкаванне Дня горада.

«Сэнс жыцця — у самім жыцці, якім бы яно ні было, — сцвярджае паэтэса, а вера і любоў даюць жыццёвыя сілы, і гэта акрыляе душу жаданнем тварыць».

Марыя ЛЯШУК

землякі

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

СЦЭНА ЯК ПАКЛІКАННЕ

Калі я пазнаёміўся на адным з семінараў творчай моладзі Віцебшчыны з акцёрам і паэтам Пятром Ламанам, цяжка было ўявіць яго ў ролі Дзеда са спектакля «Пахавайце мяне за плінтусам» або славутага Несцеркі са сцэнічнай візітоўкі тэатра. Юны, летуценны, з пышным пшанічным чубам, ён хутчэй нагадваў маладога Ясеніна, які раптам загаварыў па-беларуску.

Гэтая яго беларуская гаворка, яго вершы адразу зблізілі нас, бо, што граху таіць, і па сёння большасць нашых акцёраў у звычайным жыцці беларускай мовай не карыстаюцца. А ў Коласаўскім тэатры таго часу толькі Пятро ды Алесь Лабанок вызначаліся натуральнай беларускай гаворкай.

Пятро з гонарам расказваў пра сваё зямляцтва з Янкам Брылём, пра тое, як ён пачынаў працоўны шлях трактарыстам у родным калгасе ў Карэліцкім раёне. У ім дзіўна спалучаліся глыбокая народная аснова і тонкая інтэлігентнасць. Ён яшчэ толькі рыхтаваўся да ролі ў п'есе Казіса Сая «Клеменс», якая прынясе яму славу і вядомасць, а тады, падчас нашага знаёмства, рэжысёры яшчэ не надта песцілі яго сваёй увагай. Затое вершазнаўцы і аматары паэзіі прыкмецілі літаральна з першай падборкі ў часопісе «Маладосць».

Памятаю, як кампазітар Барыс Насоўскі, які загадваў музычнай часткай тэатра і напісаў шэраг песень на вершы Ламана, з вялікай цеплынёй гаварыў пра натуральнасць і шчырасць яго паэзіі.

Ішлі гады, мы сустракаліся не вельмі часта: то ў Віцебску падчас спектакляў і творчых сустрэч, якія ладзіў незабыўны Давід Сімановіч, то ў Полацку, куды Пятро завітваў проста, па-сяброўску. У нашым літаб'яднанні «Крыніцы» крыху з гумарам і пяшчотай называлі яго Пецечкам. А творчы шлях Ламана ў літаратуры і на сцэне набіраў абароты. І мне прыемна і радасна, што ўсё ж па вартасці землякі (і не толькі) ацанілі яго талент.

Цяпер Ламан — вядучы майстар сцэны, узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, аўтар шматлікіх кніг, перакладаў п'ес, уласнай драматургіі. Але ўсяго гэтага магло не быць, каб не падтрымалі яго на творчым старце старэйшыя сябры, такія як Рыгор Барадулін, Уладзімір Караткевіч, Янка Брыль, па словах паэта, яго «Хросны Бацька», і верныя паплечнікі па творчасці.

Пятро палюбіў Віцебск, лічыць яго другой радзімай, але прачулыя ўспаміны і цёплыя словы дорыць і роднай Гродзеншчыне. У сваім монаспектаклі «Радзіма душы» Ламан за аснову бярэ гісторыю Каложскага храма, стварае маналогі пра сваё дзяцінства, бацькоў. І хай гэты спектакль глядзяць віцебскія гледачы, але ж радзіма ў нас адна — Беларусь.

Зямля мая,
Ты ўсё ж такі існуеш
І будзеш
Існаваць
Давеку,
Каб абуджаць…
Каб шанаваць…
Каб клікаць…
Каб клікаць
Чалавека
Ў чалавеку.

Так вызначае сваё жыццёвае крэда артыст, драматург, пісьменнік Пятро Ламан. Так ён і жыве.

Зерне ісціны і алхімік... Скарына

Аднойчы напаткаў у друку нечаканае параўнанне. Маўляў, літаратуразнаўцы, якія адначасова з'яўляюцца і гісторыкамі літаратуры, — нібы свайго роду разведчыкі. У якасці прыкладу згадваліся кнігі вядомага гомельскага пісьменніка і журналіста, лаўрэата прэміі імя Баяна і Усерасійскай прэміі прафесійнага прызнання «Лепшыя пёры Расіі» Рыгора Андрэяўца «Жыццё Францыска Скарыны» і «Две битвы Древней Руси». Мелася на ўвазе, што калі ў даследчыка вялікая эрудыцыя, ён, валодаючы высокай навуковай інтуіцыяй, можа прыйсці да зусім нечаканых вывадаў. Нават да такіх, якія ў далейшым, нягледзячы на, здавалася б, сваю ілюзорнасць, пацвярджаюцца.

Прынамсі, у першай з названых кніг Рыгор Мікалаевіч выказаў меркаванне, што знакаміты першадрукар і асветнік мог бываць у Францыі. Пазней аказалася, што гэта сапраўды так. Гіпотэза Рыгора Андрэяўца стала рэальнасцю. Потым ужо сам Скарына «прыйшоў» яму на дапамогу, падштурхнуўшы да яшчэ аднаго важнага адкрыцця: у IX—X стагоддзях у міжрэччы Дняпра і Прыпяці існавала невялікая казацкая рэспубліка. Пра падзеі, звязаныя з ёю, і расказваецца ў кнізе «Две битвы Древней Руси». Гэта знакамітыя летапісныя бітвы 984 і 1016 гадоў, што адбываліся на паўднёвым усходзе цяперашняй Беларусі.

«Дапамог» жа Скарына такім чынам. Працуючы над кнігай «Жыццё Францыска Скарыны», Рыгор Мікалаевіч, узяўшы старую карту Еўропы, адзначаў «паралельнымі лініямі тыя гарады і краіны, дзе ў XV і першай палове XVI стагоддзя было заўважана выданне першых кніг. […] Паралельныя лініі, нанесеныя […] на карту, былі падобныя да ластавак, якія ляцелі ў розныя бакі і неслі людзям святло ведаў». Адна з ліній і «прывяла» ў Францыю. Такім жа метадам Рыгор Андрэявец шукаў і месца знаходжання магчымай першай казацкай рэспублікі. А ўжо адштурхоўваючыся ад яе, больш дэталёва зацікавіўся і дзвюма названымі бітвамі даўняй Русі.

Сапраўды: смеласць гарады бярэ, а дасведчанасць дазваляе адкрываць новае, невядомае. У абодвух выпадках неабходна прыкласці вельмі шмат намаганняў, каб здзейсніць задуманае. У другім, праўда, даследчыку ў нечым і цяжэй. Балазе, кроў не праліваецца, але — глядзіш — ахвярай можна стаць і самому. У тым сэнсе, што нечаканыя вывады, найперш такія, што супярэчаць афіцыйным меркаванням, шмат каму могуць не спадабацца, а таму будуць сустрэты ў штыкі. Тады і лёгка стаць «ахвярай» непаразумення.

Чаму пра гэта згадаў? Толькі што закончыў чытаць новую кнігу Рыгора Андрэяўца «Код Скарыны», што пабачыла свет у Гомельскім ААТ «Палесдрук». Кніга гэтая — найцікавейшая! Пра першага ўсходнеславянскага першадрукара, а найперш, зразумела, нашага, беларускага, нічога падобнага дагэтуль сустракаць не даводзілася. А наконт непаразумення, якое яна можа выклікаць…

Тое, пра што расказвае аўтар, адразу выкліча самыя розныя меркаванні. Часам гэта будуць рэзка супрацьлеглыя асацыяцыі. Хто прагне пачуць новае слова пра ўжо вядомае, абрадуюцца магчымасці зазірнуць у сутнасць таго, што, на першы погляд, знаходзіцца на мяжы магчымага. Можа стацца і так, што хтосьці, адштурхоўваючыся ад разваг даследчыка, паспрабуе дапоўніць яго высновы сваімі меркаваннямі, у нечым аспрэчыўшы яго думкі. Будуць і катэгарычныя апаненты: такога не было дый быць не можа!

Што ж, відавочна, што Рыгор Андрэявец не марна працаваў над «Кодам Скарыны». Менавіта аднайменнае даследаванне і дало назву яго новай кнізе. Першая ж частка — «Жыццё Францыска Скарыны» — шмат для каго стане свайго роду паўтарэннем пройдзенага. Калі з'яўляюцца розныя меркаванні, да ўсяго яшчэ і рэзка процілеглыя, — значыць, даследаванне ўдалося, чытацкая думка абудзілася. Відавочна і тое, што з цікавасцю з развагамі Рыгора Мікалаевіча пазнаёмяцца і тыя, хто сам займаецца даследаваннем жыцця і дзейнасці



Скарыны. Не толькі друкарскай, а і яго актыўным далучэннем да іншых сфер, без разумення якіх цяжка, а ў нечым і немагчыма спасцігнуць сутнасць феномена, пад які патрапляе постаць гэтага генія чалавецтва.

Рыгор Андрэявец акурат і дапамагае наблізіцца да Скарыны, каб па меры мажлівасці «затушаваць» тыя белыя плямы, што ёсць у яго біяграфіі. Ідучы сваім шляхам, не баіцца (гэта таксама важна) адмаўляць тое, што як быццам не можа выклікаць якіх-небудзь сумненняў, бо даследчыцкая думка наконт гэтага даўно ўсталявалася. Калі сумненні ў нечым і ўзнікаюць, то яны істотныя. У Андрэяўца наконт усяго іншы погляд. Як кажуць, Сакрат мне сябар, але ісціна даражэй.

Да ісціны ён і набліжаецца паступова, старанна перагортваючы старонкі біяграфіі Скарыны, падоўгу запыняючыся на тых з іх, на якіх з цягам часу «запісы» пабляклі. Свае высновы Рыгор Андрэявец робіць праз пакутлівыя развагі. Маленькае зерне ісціны, схаванае ў тоўшчы, прасейваецца ім так старанна, што толькі дзіву даешся, адкуль у яго такое цярпенне. Але ж без такой настойлівасці, што вырастае з апантанасці, і нельга, калі заглыбляешся ў «святое святых» жыццяпісу першадрукара.

Напрыклад, распаўсюджана меркаванне, што Скарына быў сакратаром у дацкага караля. Не, пераконвае аўтар, у сапраўднасці ўсё было інакш. Ён «працаваў пэўны час у трансільванскага магната, адкуль збег у Падую». Памыляюцца і тыя, даводзіць ён, хто перакананы, што асветнік і друкар наведваўся ў Маскву. Нанава «перапісвае» Рыгор Мікалаевіч і скарынаўскія старонкі, звязаныя з атрыманнем ім звання магістра «вольных навук». Па-свойму паставіўся Рыгор Андрэявец да Багдана Онкава і Якуба Бабіча. На яго думку, яны не з'яўляліся мецэнатамі Скарыны. Канечне, без іх падтрымкі свае кнігі ён надрукаваць не мог. Але ці былі гэта дабрадзеі ў поўным сэнсе гэтага слова? Так, яго намаганні падтрымлівалі. Толькі, даючы яму грошы, дбалі найперш пра ўласны дабрабыт. Асветніцтва для іх важным было, бо спрыяла паляпшэнню. Не верыцца ў такое? Прызнаюся шчыра, у гэта і мне не хацелася верыць, пакуль не пераканаўся, наколькі доказныя меркаванні Рыгора Андрэяўца.

У «Кодзе Скарыны», аднак, ёсць і самая галоўная фішка. Гэта відаць з такога сведчання: «І хаця Францыск Скарына стаў знакамітым у свеце дзякуючы выданню на старабеларускай мове Бібліі, але ўсё ж такі, як лічу я, кнігадрукаванне не было яго асноўнай сферай дзейнасці. Гэта быў толькі прыработак для таго, каб на зароблены ад продажу кніг грошы купіць уласны дом, набыць алхімічнае абсталяванне і заняцца справай Вялікага выбару, у выніку якога можна было атрымаць філасофскі камень, а ўжо з яго дапамогай пераўтвараць простыя металы ў золата і серабро, а з яго вадкай формы — эліксіра — падаўжаць жыццё чалавека».

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Спосаб змагацца са звычайнасцю

Арыгінальнасць — адзін з найважнейшых фактараў, якія вызначаюць вартасць твора. Яна можа пераважыць недахопы ў тэхніцы, часам прыхаваць пэўныя лагічныя хібы, іншымі словамі, перавесці ўвагу чытача са слабых бакоў твора на моцныя. Нядзіўна, што да арыгінальнасці імкнецца амаль кожны творца.

На вокладцы кнігі Ганны-Марыі Сітнікавай «У казкі верыць…» («Кнігазбор», 2018) значыцца надпіс, прызваны падкрэсліваць арыгінальнасць прадстаўленай у ёй творчасці: «Нелірычная паэзія». Скарыстаўшыся тым, што засталося ў галаве са школьных урокаў літаратуры, і крыху гуглам, можна даведацца, што лірычная паэзія — гэта творы, у якіх аўтар, груба кажучы, выяўляе свае пачуцці і настрой. Адпаведна, нелірычная паэзія гэтага ўсяго пазбаўлена. Аўтар прадмовы, што адкрывае кнігу, называе нелірычную паэзію «ўмоўным жанравым азначэннем», якое аб'ядноўвае пэўныя рысы змешчаных у кнізе твораў, а менавіта гумар, іронію, сатыру, гратэск, сарказм, гульню слоў, а таксама загадкавае «эксперыментальнае вершаскладанне». У пошуках такога скарбу чытач адпраўляецца ў падарожжа па кнізе, на вокладцы якой — гарбуз і мышы.

Нават калі прызвычаіўся ўсё вышэйпералічанае называць ёмкім замежным словам постмадэрнізм, да творчасці Ганны-Марыі Сітнікавай складана падабраць нейкае іншае азначэнне, акрамя таго, што дадзена ёй самой. Першы верш, пададзены «Замест прадмовы», выдатна характарызуе настрой усёй кнігі: твор пабудаваны на самаіроніі, але настолькі какетлівай, што складваецца адчуванне, быццам аўтар заадно іранізуе і з чытачоў. У далейшым гумар і іронія не пакінуць чытача ні на старонку, але скіраванасць іх становіцца даволі размытая.

Усе вершы — гэта сюжэты, бытавыя гісторыі або фантазіі-замалёўкі. Персанажамі ў першых часцей за ўсё выступае нелірычная гераіня і яе муж, у другіх — жыхары іншых краін або жывёлы. Што тычыцца жывёл, у гісторыі аўтара часцей за ўсё трапляюць каты. У багатай фантазіі Ганны-Марыі Сітнікавай такая сюжэтная разнастайнасць сумнявацца не дазваляе. А вось гумар, якім прасякнуты гісторыі, — вельмі своеасаблівы, на аматара. Замалёўкі пра жанчыну, якая марыць пра далёкія краіны, і праз гэта ў яе падгараюць катлеты, або пра мужчыну, які вырашае, што жонка яму хутка здрадзіць, знайшоўшы ў яе пад падушкай любоўны раман, магчыма, для кагосьці з'яўляюцца надзённымі і смешнымі. Але заяўленае ў прадмове «эксперыментальнае вершаскладанне» прадстаўлена творамі, напісанымі без выкарыстання пэўных літар або з упляценнем у тэкст іншамоўных слоў, а таксама даўно не новымі для 2018 года інтэрнэт-жанрамі «піражкоў» і «парашкоў». Усе гэтыя ўскладненні можна расцэньваць як гульню або практыкаванні, але назваць іх эксперыментамі, на мой погляд, даволі цяжка, бо яны не нясуць за сабой ні адкрыццяў, ні нават пэўных мэт.

Кніга на самай справе адрозніваецца ад звычайных рэфлексіўных вершаў, перапоўненых пачуццямі, але пабудова думкі і логіка дзеяння ў творах не заўсёды аблягчаюць чытачу разуменне сэнсу і, можа, праз гэта арыгінальнасць сюжэтаў губляе вастрыню. Імкненне выклікаць смех не заўсёды азначае, што кантакт паміж аўтарам і чытачом будзе лепшым, чым калі б у творах была проста шчырасць.

Дар'я СМІРНОВА

Возера — пункт адліку



Мясціны, дзе чалавек нараджаецца, усведамляе сябе як часцінку чагосьці вялікага, сталее і спазнае сусвет, застаюцца з ім назаўсёды, нават калі ён з'язджае кудысьці далёка. Застаюцца часткай яго светабудовы, успамінамі, ідэальным прытулкам для душы, дзе заўсёды цёпла і ўтульна. Паэтычны расповед Алеся Аркуша пра родныя яму мясціны пад вокладкай зборніка «Возера Вялікае» летась пабачыў свет у Полацку (Выдавецкая ініцыятыва «Полацкае ляда»).

Расповед мае закальцаваную структуру: твор, які адкрывае кнігу, і твор, якім зборнік завяршаецца, пачынаюцца аднолькава:

на возеры Вялікім...

Першы з вершаў аўтар прысвяціў бацькам, а ў самім творы ідзе гаворка пра дзеда, у апошнім — «...чаўны ўспамінаў / плывуць на чырвань сонца / па вечаровых сцежках». Метафізічная «вада» ў «возеры» неаднастайная: гэта і верлібры, і традыцыйныя зарыфмаваныя вершы, і трохрадкоўі. Дзе-нідзе можна трапіць і на «гарэзлівых русалак», якія «лёскі блытаюць / маладому рыбаку», і ў вір паміж хваль «чорнае ракі», дзе

...Не відаць на дне нічога —
Барада вадзяніка
Захінае дно старанна
І матляецца, як віж...

Ёсць у «возеры» і некалькі выспачак — украпленні ўспамінаў, пададзеных празаічным тэкстам: «Праз возера ў школу (згадвае мама)», «Поўны кашур еджгуроў і платвы (згадвае хросны бацька — дзядзька Андрэй)», «Мяне пахрысцілі падчас вайны (згадвае мама)». Усё гэта мае дачыненне да вады, нават згадка пра хрышчэнне: «Памятаю, пырскалі, мазалі...» І хаця няма тут ні метафар, ні ўласна паэтычных вобразаў, але прадмет расповеду — жыццё продкаў як пастаяннае пераадоленне (паходы ў далёкую школу: праз залевы, завеі, «сумёты па пояс», вайна, галоднае дзяцінства) і ўяўляецца вялізным намаганнем па стварэнні паэмы жыцця, існавання роду.

Асоба аўтара ў расповедзе — як частка наваколля. Не вышэй ад іншых аб'ектаў: дрэў, туману, валуноў, трыснягу, аеру, дзьмухаўцоў ды рамонкаў. Асабліва шмат усюды птушак — у лесе, на возеры, ва ўспамінах: «белая кірля майго лёсу», «родныя кнігаўкі», грак, ластаўкі, «цікаўная каўка», зязюля, «заклапочаныя шпакі», сініцы, каршун.

Маляўнічымі, вобразнымі, удалымі выглядаюць многія трохрадкоўі. Некаторыя па ўспрыманні нагадваюць шэдэўры японскага майстра слова XVII стагоддзя Басё, у творах якога частымі з'яўляюцца вобразы восені і ветру, дрэў і траў, першага ці апошняга снегу, вады і месяца, матылькоў і кветак, птушак і рыб. Са звыклага, добра знаёмага, будзённага раптам паўстае яркая нечаканая карцінка:

месяц заўсёды
такі вялікі
над родным лугам

альбо

у маскіровачных цяльняшках
акуні ля берага
стаіліся ў засадзе

Усё — роздум, медытацыя, філасофскія параўнанні. А дзе-нідзе інтэлектуальны пачатак нібы застаецца па-за кадрам, і цудоўная карцінка прыроднай паўнаты, яе самадастатковасць і велічнасць судакранаюцца з душою апавядальніка (а праз яе — і чытача) напрамую, без спроб ахапіць яе розумам, і атрымліваецца быццам фатаграфічны адбітак:

чараты выгінаюцца
нібы вадзянік грае
на іх рок-н-рол

У расповедзе арганічна суіснуюць і Вялес, і «гайвораны», і лік Хрыста, які заўсёды адводзіў бяду. І... «цішыня — як погляд Бога, / быццам там чакаюць цудаў...» Ідэальная вясковая замалёўка — сама як метафара беларускай ментальнасці. У адным з вершаў аўтар разважае: «...нават чалавеку / цяжка ўцяміць / як трава ператвараецца / ў малако». Але працэс адбываецца — незалежна ад яго асэнсавання. Як і хараство, прыгажосць гэтай зямлі, маляўнічасць яе азёраў і рэк (з усімі іх таемнымі вірамі) кандэнсуюцца ў душах тых, хто тут жыве.

Яна БУДОВІЧ

Пчолка з вулея Ніны Мацяш

«На Берасцейшчыне шмат паэтаў. Гайдаюцца, як птушкі на Жырандолі… Чэрпаюць вёдрамі мёд на пчальніку ў Міколы Папекі, у сябрыне каля "Берасцейскага вогнішча" або на "Дзядзінцы", папіваюць сабе тую пчолкавую салодкую прэмію. Ніна іх будзіць напрадвесні, выпускае на канюшыну, а восенню склікае ў вулей…» (Данута Бічэль).

Нядаўна пабачыў свет зборнік паэзіі Святланы Варонік «Пацеркі даверу». Прайшло некалькі гадоў пасля выхаду яе першага зборніка «Матчына дрэва». Вершы-роздумы, развагі пра перажытае і набалелае блізкія чытачу. Вобразы, выспелыя ў мітрэнгах жыццёвых будняў, сталі святам святла ў словах:

Самлеў на пожні васілёк.
Жніво.
Зярняты вернуцца ў далоні.

«Пацеркі даверу», сабраныя на нітку караляў, складаюць 12 раздзелаў, аб'яднаных адчуваннем светласці душы аўтара. Старонка за старонкай ажываюць у метафарах, вобразах і з'явах: «вецер вербы шкадаваў», «змяіцца сцежка», «дождж слугуе настрою», «ліпень ліпіць дажджамі»... Доўжыць гэты працяг можна бясконца. Часты госць у паэтэсы дождж: ён «паратункавы ад самоты», «адзіноту спраўджвае дождж», «дажджы не ўспамінай», «задажджыліся дні», «дождж мае чорны колер: парасон», «дождж сляпы».

Раздзел «Чытаю белы ліст паперы» — невымоўны боль па блізкім чалавеку:

Мама…
Мне так мала трэба —
Ты.

Утульна пачувае сябе паэтэса ў роднай хаце:

На ганку роднай хаты…
Як на вяршыні.

Не абышла аўтар зборніка ўвагай і духоўную спадчыну Ніны Мацяш. «Снежаньская ружа» з раздзела «На сцежках снег» — удзячнасць былому сяброўству:

Птушыны грай…
І кожным пер'ечкам
віны
глядзяць
карціны са сцяны



Гэтак Святлана піша пра захапленне, альбо хобі, Ніны Мацяш — мастацкія карціны, якія яна вырабляла з фарбаванага пер'я птушак.

Глыбокі падтэкст схаваны ў кожным радку зборніка, які чакае ўдумлівага чытача. Стаць побач са Святланай Варонік, дакрануцца да споведзі яе душы змаглі настаўнікі, былыя яе студэнты і калегі з універсітэта і ўсе, хто неабыякавы да беларускага слова. А прыхільнікаў яе творчасці нямала ва ўстановах адукацыі, дзе паэтэса — часты госць. Вельмі мілагучныя яе песні на словы Яўгеніі Янішчыц, Ніны Мацяш, а таксама народныя пад гітару ці гармонік.

Нізкі вершаў саджае яна ў соты медазбору беларускага вулея і спраўджвае чароўнасць і магічнасць моватворчасці пісьменніцкага таленту.

Ніна ДРЫК

Праз прызму гумару

Засмяяцца добрым, светлым смехам
можа толькі глыбокая добрая душа.
Мікалай Гогаль

Што можа выратаваць чалавека ад безнадзейнасці, ад самоты і адчаю? Што дапаможа яму ў хвіліны, калі навакольны свет звужаецца і здаецца, што з цяжкай сітуацыі няма выйсця? Панацэя ёсць, і гэта — гумар. Ён стварае своеасаблівую оптыку, якая дазваляе зірнуць на праблему з іншага боку. Бо смех існуе столькі, колькі жыве чалавецтва — варта звярнуцца да творчасці Арыстафана, Бакача, Рабле…

Шмат каму наш беларускі гумар падаецца бляклым і невыразным — маўляў, хіба гэтыя асцярожненькія, прычасаныя жарцікі, якія друкуе «Вожык», могуць канкурыраваць з сучаснымі зборнікамі «барадатых» анекдотаў, з досціпам зорак стэндапу, «КВЗ», рэп-батлаў ці «*Comedy Club*»? Канечне, не. Бо гэта проста розныя сусветы. Мажліва, «бяда» беларускага гумару ў тым, што ён занадта сціплы, інтэлігентны і выхаваны?

Параўнаць замежны жарт з нашым прапануе беларускаму чытачу вядомы айчынны гумарыст Міхась Сліва, які ўжо не адно дзесяцігоддзе плённа працуе ў гэтым кірунку. Яго творы неаднаразова адзначаліся рэспубліканскімі прэміямі, ён аўтар шматлікіх кніг прозы, публіцыст, крытык. Яго смех не злосны, жарт — цёплы, сяброўскі, зычлівы.

Сёлета ў выдавецтве «Чатыры Чвэрці» ў серыі «Незур'ёзна пра сур'ёзнае» пабачыў свет новы празаічны зборнік пад назвай «Ідэальная жонка», у якім пісьменнік выступіў у якасці перакладчыка. Кнігу склалі перастварэнні паводле твораў замежных майстроў гумарэскі. «Пакуль мы смяёмся — з намі ўсё ў парадку» — такое выказванне амерыканскага празаіка Сола Белоу служыць эпіграфам да кнігі. Апавяданні, што ўвайшлі сюды, варта прачытаць, каб чарговы раз пераканацца: межы паміж дзяржавамі — у нас у галовах. Людзі ўсюды аднолькавыя, і смяюцца яны з аднаго і таго ж.

Дзякуючы Міхасю Сліву, у чытача з'явілася магчымасць пазнаёміцца з гумарам найбліжэйшых суседзяў — украінцаў, чэхаў, расіян, балгар, палякаў. Аднак сустракаюцца і творы літаратараў з Татарстана, ЗША, Італіі, Турцыі, Аўстраліі.

Найбольшую ўвагу Міхась Сліва ўдзяляе нашым паўднёвым суседзям. Прычым Украіна прадстаўлена ў асноўным пісьменнікамі савецкага перыяду — гэта Астап Вішня, Рыгор Шыян, Паўло Кушч, Ігар Лагоза, Віктар Семяняка… Кідаецца ў вочы злабадзённая, або, як казалі раней, выкрывальніцкая, фельетонная тэматыка. Добра гэта ці дрэнна — меркаваць чытачу, але многія вострыя пытанні, што закраналі ў сваіх гумарэсках украінскія савецкія пісьменнікі, такія як бюракратыя, падхалімаж, хамства і некампетэнтнасць начальства, застаюцца актуальнымі і сёння… Напрыклад, апавяданне Людмілы Каліноўскай «Празявалі» нібыта спісана з сучаснасці, настолькі тыпова адлюстраваны тут узаемаадносіны ў калектыве на фоне адной з праверак. Прадстаўлена таксама ў кнізе творчасць украінскага філосафа і пісьменніка Рыгора Скаварады: тут змешчаны яго «Байкі харкаўскія». Знайшлі сваё месца ў выданні і апавяданні чэшскіх пісьменнікаў Карэла Чапека і Яраслава Гашака. З расійскіх — Тэфі, Алега Дараганя, Эдуарда Угулавы. Пытанню, як сумясціць творчасць і штодзённы побыт, прысвечаны аповед турэцкага пісьменніка Шакіра Баклы.

Сяброўства і варажнеча, сквапнасць і шчодрасць, глупства і дасціпнасць, сумленне і зрада, смех скрозь слёзы — на старонках кнігі чытач знойдзе самы шырокі спектр жыццёвых праяўленняў. Падаецца, што задачай Міхася Слівы было паказаць шматграннасць гумару, не абмежаванага нейкай адной мясцовасцю ці менталітэтам. Адметна: у кнізе няма пошласці і непрыстойнасці, што сведчыць пра эстэтычны і літаратурны густ перакладчыка-ўкладальніка. Падобных выданняў не хапае ў нашай літаратурнай прасторы, і той факт, што выдавецтва праз сваю арыгінальную і цікавую серыю знаёміць чытача з гэткімі творамі, не можа не ўсцешваць.

Янка ЛАЙКОЎ

Віктар ГАРДЗЕЙ

«АХ, ЛЮБІСТА-ЛЮБКА, ШТО ТВАЕ МНЕ ЧАРЫ?»

Цвяток любісты…

Тут, наўсцяж Імшэчка, там, у глухамані,
Ведзьмінае хаткі, пэўна, не было.
Адзінока Яні і не спіцца Мані —
Шчасце ў пацалунках міма праплыло.

Жаніхоў аблудных дзесь у эмпірэях
Лепш не намалююць ні Шагал, ні Пэн.
Зноў па завуголлях на вятрах-барэях
Драмы векавечнай чуецца рэфрэн:

— Апаўночы люба пахадзіць на пару,
Чыйсьці смех развее смутак і нуду.
Нагаворных зёлак завару, напару —
Вось цвяток любісты… І яшчэ знайду.

Ах, любіста-любка, што твае мне чары?
Воблік з маладосці мільгануў і знік.
Не падсвечвай цьмяна боскія абшары
Колерам разлукі, жоўты маладзік.

Ведзьміная хатка на курыных ножках,
Стань ка мне дзвярыма — я ж і сам вядзьмак,
Дый вандроўнік даўні па крывых дарожках —
Ведзьміную хатку абмінуў няўзнак.

Сярод калосся…

Адны выдаткі, толькі страты,
Жыццё ледзь тузаць пачало.
Хіба не ўсе палеткі зжаты?
Маршчынкі леглі на чало,
А ты як быццам вінаваты.

За сінь-смугою палявою
І сум знайшоў, і першы боль.
Няўтульна сейбіту і вою,
Калі на свой ступіў мазоль
Пад рысай неба ракавою.

Жадаць гармоніі і ладу,
Ды ўсё, што дужа тузане,
Як рамантычную баладу,
Забыць не дадзенае мне —
То шлях да вечнасці ў абладу.

Прайшоў ці мала, а ці многа,
Сябе пачуй, сагнуты ў крук:
Сярод калосся наліўнога
На вуснах так знікае гук
І ўжо залее слова Бога.

Міжсезонне

Вятроў паўночных гоніць пройму
На чарналес, на чарнатроп.
Піцуй, сябрына, наўзахоп
Хатуль дарожны, бо, па-мойму,
Які сезон — і шлях такі,
І ўжо не сціхнуць скразнякі,
Хутчэй, буран заглушыць пройму.

У міжсезонне скрозь на ўлоннях
І праўда многа чарнаты,
Як не стае на ўсе куты
Святла парэшткаў з падваконня,
А тут і ноч бярэ ў палон,
Ды зразумела: не цыклон —
Прычына стойкага бяссоння.

Ні мудрых дзей, ні антуражу
Для свежай рыфмы і задум.
Багата што пайшло на глум,—
Залез у схоў і не вылажу.
Станчэў насценны каляндар,
Узвее снег — цыклонаў дар,
Бярэзнікі матаюць пражу.

Буран прадзьме лясныя шаты —
Гудзе, трасе… А ўранку — ціш.
У одуме сваім не спіш,
Няма віны — няма адплаты.
Бяры хатуль — пайшлі дамоў,
Буран хаця б не перамёў
Дарогу ў Божыя палаты.

Гэлька

Тая вёска ў легенды і былі
Перайшла цераз поплаў і гаць.
Помнім Гэльку, а штось і забылі,
Дык няма ўжо ў каго распытаць.

Зорны жнівень і час ілюзорны,
Пэўна, шчасце, але не бяда.
Загуменных гусей, ці фальклорных,
Апусцілася ў двор чарада.

Тлумны дзень, а каму і пахмелле,
Адхіні хоць на міг сіняву:
Дзе стаю, тут грымела вяселле,
І кадрылі тапталі траву.

Спатыкаецца сват не панылы,
Кружыць вальсы жаніх малады.
Гусі Гэльку ўхапілі на крылы,
Паняслі невядома куды.

Праляцелі над Гэльчынай хатай,
У легенды і міфы сплылі…
Уздыхае гармонік зацята,
Бубен бомкне — нібы з-пад зямлі.

У зялёных нетрах

Раяць дамаседу: чыстага паветра
Наглытацца ўдосталь у зялёных нетрах,
І адразу ўчуеш буйных сіл прыліў.
Клікалі алені, запрашаюць лані
Паблукаць па Шчары, пагуляць на Лані —
Хараством ваколіц сэрца б наталіў.
Гонар свой у рэчак, і яны, дарэчы,
Кланяцца не стануць блуднаму старэчы.

Як малітва кажа, і цяпер, і прысна,
(Значыць, вечна) цэняць тое, што карысна.
Настальгія мучыць, цісне ўсё мацней:
З болем непадкупным, без лухты кіношнай,
Ля бабрынай хаткі, пэўна, не апошняй,
Бобрыку ўсміхнуцца, а пасля — на Цне,
Дзе паўз вёскі Люсін і Малой Палоні
У ваўкоў вяселлі і свае пагоні.

Што ж пайду, паеду — дзякуй за парады,
Можа, па міжрэччах нехта будзе рады,
Рыжая якая ўспомніць праз гады:
На пірог да чаю замясіла б цеста,
Хоць і не падражняць жаніхом з нявестай
І цяпер, і прысна, як было тады…
Дзесьці тут, на Лані, дзесьці там, на Шчары,
Ходзяць і знікаюць закаханых пары.

Успамін заснежанага дзяцінства

Гляджу ў акно — не птах залётны,
Я тут жыву ў хаціне той,
Дзе з дыму белыя палотны,
Як нейкі прывідны падман,
Два каміны ткуць над страхой —
Пад ветразем плыві ў туман!

Мароз крапчэй. Ідуць эскадры —
І каміны, і скрозь дымы.
Засведчаць сцюжу кінакадры,
Але няма на іх мяне.
Гарысты водшыб, лес нямы
Наўсцяж у снежнай белізне.

Мінае дзень, і вось з паходу
Вяртаюцца ўжо караблі.
Авой! Дык дзедаў брыг ля броду
Ці не ўзялі на абардаж?
Паніклы ветразь да зямлі,
Абвіслі снасці, такелаж.

То сцішана, то з новай сілай
Вятры гудуць усю зіму.
Спыніўся пад сцяной пахілай
Мой дзед Сцяпан, як воўк марскі:
— А дыферэнт, бач, на карму,
Дый што казаць — буран такі!

На пульхны снег няма ахвоты
З акна глядзець штодня ў журбе.
— Ах, дзед Сцяпан, пашый мне боты!
Ад ветразяў трымціць абшар,
Дык буду юнгаю табе —
Патопім з ходу шлюп карсар.

Пад старым дубам

Там цяпер старыя дрэвы,
Дзе гуляла маладосць.
Недапевы, перагрэвы —
Не сумуйце, ваша мосць!

Дуб успомніў як інтрыгу:
— Го, пад «мухаю» танцор!
Што замовім: польку? джыгу? —
Аркестрантам сініх зор?

Сам Эол на арфе трымкаў
Пра высокую мараль.
Дзеўка пстрыкнула з абдымкаў —
Не вярнулася, на жаль.

Полька любіць свойскі побыт,
Джыга цэніць грог і ром.
Ваша мосць, ці чутны дробат,
Хоць з прыпеўкай, хоць маўчком?

Дубу ўзвей, ужо вячорны,
Расчасаў зялёны чуб.
Дуб зусім не бутафорны,
А сапраўдны гэты дуб.

Калядкі

Не бывае зіма без варон,
А закончаны рух — без аглядкі.
Успамін малалецтву ўдагон:
Я любіў, смешны ваш ахламон,
Каб на вёсцы гучалі калядкі.

Позні гурт у найбліжэйшым двары
Шчадраваў Усявышняга ласкай.
Запрашайце гасцей, спадары!
Тут казёл і ваўчына стары —
Не пазнаеш суседа пад маскай.

То не здань — снег ля вокнаў рыпеў,
Спіць трывожна бязлюдная вёска.
Літасць неба ці праведны гнеў?
Певень дзесьці далёка прапеў,
Ды няма і ў яго падгалоска.

Ах, калядкі! Сняжок і слядок.
Я люблю дзею з драмы забытай.
Ах, спадар! Налівай, а не сок,
Па Марусін, як ёсць, паясок —
Паспяваем пра долю і жыта.

Вечны зніч да вуглёў не патух,
І вароны крычаць з буралому.
Не пакіне душу Божы дух,
Шанец ёсць, а закончаны рух
Не патрэбны ўжо болей нікому.

Паміж Плутархам і Глобам

Кій жабрацкі і посах манаршы —
Забыцця на аджытым пячаць.
Там рапсодыі смутку гучаць,
Дзе гучалі бадзёрыя маршы.

Нам належнае па пратаколу
Тое ж золата і серабро.
Невядомае людзям бюро
Шлях пазначыць гісторыі колу.

Я, пакліканы ў свет навакольны,
Разам з вамі стаю на шляху
І прызнаюся, як на духу:
Разумець гэты свет больш не здольны.

Не сказаць, каб зусім пусталобы,
Знаю: творыць гісторыю час.
Што чакае знядоленых нас,
Не паеду распытваць да Глобы.

Лепш паслухаў бы доказ Плутарха:
Кола коціцца д'яблу назло
І раструшчыць, як часта было,
Жабрака і самога манарха.

Кулікі

Кулікі чуваць у закуліччы,
Дзе відочны паўз лясок густы
Мілыя дзявочыя аблічча —
Кружацца, як жоўтыя лісты.

Колькі іх — лічыць няма падставы,
Сыплюцца замест лістоў з галін.
Па знаёмых сцежках праз канавы
Я хаджу з пяшчотаю адзін.

Справа тут у шумным лістападзе,
А пражыта — круглы юбілей!
Неба ўскрай, як вусны, што ў памадзе,
І таму аблічча ўсе мілей.

Будзе снежань. Нудны гул мяцеліц.
І здаецца: гэта на вякі!
Кулікі яшчэ не адляцелі,
Плачуць і сумуюць кулікі.

Вольга СІРОЦІНА

Кляновы ліст

Ліст адзінокі кляновы
Трымціць на галінцы, матляецца —
Заўзята вятрыска-свавольнік
Так дражніць яго, з ім гуляецца.

Тонкай сцяблінкай штомоцы
Лісток за галінку хапаецца:
Страшна яму, небараку,
Сарвецца вось-вось, не ўтрымаецца...

...Як жа вольна ў прасторы,
Па-над люстрамі лужын!
Вецер вальсуе з ім, кружыць —
Варта было страх адужаць!..

Дыялог з мінулым

— Як жывеш? — запытаеш. — Як маешся?
І аб чым тваё сэрца баліць?
Адкажу:
— У мінулае больш не ўзіраюся,
Успамін у душы не трымціць...
Хоць завейна лютуе зіма яшчэ,
Спадзяюся не лепшае зноў,
Калі ты мне лагодна ўсміхаешся,
Усё менш змрочных мроіцца сноў.
Мала трэба для шчасця парой мне:
Неба яркага, слова ўрачыстага...
Хай цябе зберажэ пад пакровамі
Маці Прачыстая...

Фота Кастуся Дробава.

Анёл Гаўрыла

Кароткія апавяданні

Алесь БЫЧКОЎСКІ

ЛІСТЫ ДА МАЦІ

Сяргей прышкандыбаў з працы стомлены. Толькі пераступіў ганак роднай хаты, на яго абрынуўся водар цеплыні, спакою і ўтульнасці. Вяртацца дадому пасля напружанага працоўнага дня заўсёды было асалодай і вялікім шчасцем. Нібыта карабель са сцюдзёнага мора — у ціхі порт — так і Сяргей вяртаўся да чысціні, да паху гарачага печыва з ванілінам або хатніх булак з разынкамі, да згатаванай вячэры…

Дачка Алеся завіхалася на кухні. Алеська — спраўная дзеўка. І ў школцы выдатніца, і па гаспадарцы — надзейная апора. Міжволі падумалася: добрая гаспадынька расце камусьці. Сэрца на імгненне сціснулася.

Сяргей сцягнуў боты. Хацеў ціха, крадком паявіцца ў хаце, жартам напужаць дзяцей. Але выпадкова грукнуў ботам аб падлогу. Адразу ўстрапянуўся меншы Алёшка.

— Татка вярнуўся! — ён выбег у вітальню насустрач, падскочыў і павіс на шыі Сяргея. Той усміхнуўся, абняў сына.

— Ну што, сёння напішам ліст да мамы? Ты ж абяцаў!

— Напішам-напішам, дзеткі, дайце распрануцца і памыць рукі.

— Вячэра гатова, — паказалася Алеська. — Сёння — таўканіца са смажанымі грыбамі, як табе падабаецца. На дэсерт — хатняе печыва з гарбатай.

Расчулены, Сяргей падаўся да рукамыйніка.

— Та, як справы? — гэта павітаўся Іллюк. Дарослы, сур'ёзны хлопец, адзінаццацікласнік. Разважлівы і дужы. Хоча пайсці ў войска, застацца пасля па кантракце і зрабіць вайсковую кар'еру. Сяргей падтрымлівае выбар сына, не замінае яму.

— Сёння лісты маці напішам, — крыху змрачнавата азваўся на вітанне бацька. Іллюк моўчкі хітнуў галавой у адказ.

Іллюку, як і Алесі, нічога не трэба было тлумачыць, выраслі абое, добра разумелі свайго саракагадовага бацьку. Выдумляць казку трэба было толькі для Алёшкі, які сумаваў па матулі і часцяком яе ўспамінаў. Матуля была іх шчымлівым болем, тугой.

— Маму забралі анёлы? — лез з роспытамі Алёшка. — Але ж анёлы аддадуць яе назад? У нядзельнай школе нам распавядалі пра анёла Гаўрылу, які добрыя весткі прыносіць. Я маліўся, каб ён расказаў нам пра маці, а ёй распавёў пра нас!

Ад гэтых слоў Сяргею вячэра ў рот не лезла.

Сядзелі за сталом разам: тата і трое дзетак. Сяргей не забараняў дзецям размаўляць за вячэрай. Папярэджваў толькі, каб з поўнымі ратамі гэта не рабілі.

У асноўным гаворка цякла пра школьныя справы. Алеська на спаборніцтвах па бегу заняла прызавое месца. Пахвалілі. Прывезла са спаборніцтваў медаль, падзячны ліст і прыз — канькі. Парадаваліся ўсім сямействам, пажадалі поспехаў. Іллюк трошкі «кульгаў» у дакладных навуках, але вельмі стараўся, бо надта ўжо хацеў трапіць у ваенную вучэльню. Алёшка ж — аматар малявання, урокі выяўленчага мастацтва ў яго самыя любімыя.

Пасля вячэры — пісьмо да матулі.

Яны пісалі штомесяц дваццаць першага чысла, калі матулі раптам не стала ў іх штодзённым жыцці. Пісалі па ініцыятыве Алёшкі, якую ўсёй сям'ёй ухвалілі і падтрымалі, каб хлопчык не зажурыўся, не занудзіўся.

Прыбралі са стала, вымылі посуд і паселі з чатырох бакоў. Кожны пісаў асобна. Дзяліўся набалелым, выказваў пачуцці, думкі, распавядаў пра асабістае, і кожны прызнаваўся ў любові да маці, казаў, як ім усім сумна і адзінока без яе, што яны ўсе нястомна чакаюць сустрэчы.

Сяргей таксама выварочваў душу, набрынялую схаванымі затоенымі слязьмі. Пісаў, як яму няпроста трываць складаны вырак лёсу, як самотна і халодна ў адзіноце па начах ляжаць у ложку, калі захлынае бессань. Як ён мусіць усё рабіць адзін, цягнуць воз, ды, дзякаваць богу, дзеткі слаўныя, усе ў бацьку, працавітыя. Далібог, праўду кажуць: дзеці — найвышэйшая ўзнагарода і надзейная падтрымка. Калі б не яны, сканаў бы да пары з-за смутку. Прыгадваў сумесную іх з Тамарай маладосць, каханне-мілаванне. І шкадаваў па страчаным раі.

Лісты да маці сталі асабістым сямейным рытуалам, вядомым толькі ім чатыром і больш нікому. Гэта была ўнутрысямейная тайна, у якую, барані бог, не пасвячалі не толькі чужынцаў, але нават сваякоў і родных. Недасведчанаму гэта магло падацца якімсьці рэлігійным культам. А нехта мог і пакруціць пальцам ля скроні, параіць выклікаць камісію па сацыяльна небяспечных становішчах. Маўляў, што гэта ты дзетак прымушаеш пісаць нейкія дзіўныя лісты? Забабоны, сектанцтва! І скажуць жа так абавязкова, бо не ведаюць пра тую акалічнасць, у якой заключаецца іх невытлумачальная, амаль неспасцігальная таямніца.

Дзеці моўчкі працягнулі спісаныя аркушы паперы бацьку.

— Перадасі анёлу Гаўрылу, каб паляцеў да маці, аднёс нашы лісты? — удакладніў Алёшка.

— Перадам, абавязкова перадам, — запэўніў тата.

Калі дзеці разбрыліся па пакоях і леглі спаць, Сяргей сеў за стол, занурыўся ў глыбокія думкі. Ужо два гады мінула, як Тамары не было з імі. А нібыта вечнасць. Затым дастаў з шуфляды канверт. Аркушы ўклаў туды, запячатаў і пачаў пісаць адрас. Той самы дакладны адрас, які запомніў назаўсёды. Жаночая выпраўленчая калонія нумар… атрад нумар… Колькі там дазволена на працягу года лістоў атрымліваць? Ці ўсе яны даходзяць да Тамары? Ці чытае іх жонка? За два гады — ніводнага адказу. А сядзець Тамарцы яшчэ і сядзець, кукаваць доўга. Сяргей не мог рады даць, чаму дбайная жонка і добрая маці пайшла па руках, у моцныя загулы-запоі, па тыдні дахаты не паказвалася. І бацькоўскіх правоў пазбавілі, і за зладзействы за краты ўпяклі. Але дзеці і муж усё роўна яе моцна любяць, спадзяюцца на сустрэчу, мараць пра вяртанне маці ў сям'ю. Яны гатовы на ўсё забыцца і ўсё прабачыць, дараваць. І ахінуць пяшчотай.

Асабліва малы Алёшка.

І анёл Гаўрыла са стосам лістоў у руках.

«НАВУКОВЕЦ»

Сашок кружляе вакол фермы і раз-пораз некуды шпурляе камяні. Кіне, назірае за палётам і адно слова прамаўляе толькі: «Аднак».

Сашок пастухом працуе, але тое не важна. Важнае — у шпурлянні камення. Два тыдні Сашок ужо сноўдаецца вакол фермы. І толькі адно слова як малітва: «Аднак». Тутэйшым цікава. Але, паслухаўшы тлумачэнні, пасылаюць Сашка як мага далей…

Цікава і загадчыку фермы.

— Вывучаю крывізну прасторы-часу ва ўмовах гравітацыі, — дае тлумачэнні Сашок у адказ на яго пытанне.

Загадчык доўга кашляе.

— Камень атрымлівае ад рукі прамалінейны рух і пастаянную хуткасць, але падае пад уплывам зямнога гравітацыйнага поля, прыцяжэння. Прастора скрыўлена, як і належыць прасторы.

— Вакол фермы скрыўлена? — недаверліва ўдакладняе загадчык, калі нарэшце пракашліваецца.

— Аднак.

— Што — «аднак»?

— Аднак баюся, каб і самому з дэкартавых каардынат не выпасці!

Дарэчы, дзядзька Сашка — вядомы навуковец Мікола Прашковіч. Сашок ганарыўся здымкам, на якім яго дзядзька побач з Уладзімірам Караткевічам, Яўгеніяй Янішчыц, Адамам Мальдзісам. Усім паказваў. Пакуль здымак хтосьці не скраў. А мо ён проста праваліўся ў іншае вымярэнне?..

СЯСТРЫЧКА

Калі Надзейка была малая, маці аднойчы адлупцавала яе за тое, што тая з'ела ўсе цукеркі і не падзялілася з сястрычкай. Маці была заўсёды незадаволена жыццём: муж кінуў яе яшчэ падчас цяжарнасці, бо дужа не хацеў дзяцей і адказнасці. Вось і звяжыся з такім шалапутным, які калі што, адразу дасць лататы! Карацей, усё-такі з'явілася Надзейка на свет Божы. Выпала расці без таткі, а што рабіць? Маці песціла і выхоўвала. Выхоўвала і песціла. З усіх сіл. Адна. Такая жаночая доля.

Часам Надзейка пачувалася як у пекле. Усё з-за сястрычкі. Маці дужа хацела, каб Надзейка вырасла спагадлівая, не сквапная. Здабудзе маці прысмакаў — трэба падзяліцца з сястрычкай. Купіць новую сукенку — нават не думай апрануць, каб прымераць, бо яна для сястрычкі. У школку новы ранец, заплечнік — няхай спачатку сястрычка пафарсіць. Вырасла, засвярбела замуж. Пачакай, перш-наперш выдадзім замуж сястрычку, пасля толькі — кажа маці. У нябогі Надзейкі жыццё цякло-бегла пад дэвізам: «Усё найлепшае — сястрычцы».

З-за сястрычкі свет быў ён нямілы. Здаецца, і што тут дрэннага? Праўду ж маці кажа, правільна выхоўвае. Як жа не падзяліцца з сястрычкай роднай? Адно што наконт замужжа Надзейка не паслухалася матулю: калі вырасла, адразу выскачыла. І правільна зрабіла.

Праўда ж хавалася ў тым, што ніякай сястрычкі ў Надзейкі ніколі не было, а маці пакутавала на шызафрэнію. Паставіўшы несуцяшальны дыягназ, урачы зрабілі выснову, што з той формай адхіленняў, якая назіраецца ў Надзейчынай маці, без праблем можна жыць у соцыуме. Бацька ж і развёўся з тае прычыны, але гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

АЛЕНЧЫНА КАХАННЕ

Жыла-была дзяўчынка Аленка. Калі ёй споўнілася трынаццаць гадкоў, закахалася яна ў аднакласніка. Аднак трынаццаць — мо і не самы лепшы ўзрост для кахання і пяшчотных пачуццяў. Дзяўчынкі, вядома, выспяваюць хутчэй за хлапчукоў. У такім узросце ў многіх вецер у галаве замест вучобы. Але толькі не ў сардэчнага абранніка Аленкі. Той старанна вывучаў алгебру і, відавочна, збіраўся стаць прафесарам. Нават акуляры насіў.

Ён падабаўся Аленцы: кволы, нязграбны хлапчук, у якога на ўроках усе спісвалі. Уздыхала ўслед «вучонаму», «рабіла вочкі» пры сустрэчы і часам неадрыўна свідравала позіркам, у думках пасылаючы пацалункі. Хлопчык чырванеў і, канечне, пра нешта здагадваўся, але нязменна ўтыркаўся ў кніжкі з формуламі, употай кідаючы на Аленку кароткія позіркі. Затым расказаў пра гэта сваёй бабулі.

— Навошта табе гэтыя варэпаўкі? Малады яшчэ, табе вучыцца трэба!

Строгая была бабуля, раней у «дзіцячым пакоі» працавала.

Так, першае каханне Аленкі атрымалася няшчасным. І не было каму ёй пажаліцца, хіба толькі дзядулю. Дзядуля ж на пенсіі зладзіў майстэрню, у якой рабіў дыхтоўныя шпакоўні — на радасць сабе і на карысць птушачкам. Ён не дужа ўслухоўваўся ў расповеды ўнучкі. Працягнуў Аленцы малаток з цвікамі і паказаў, як правільна збіваюцца дошкі.

І здарыўся цуд! Калі першая Аленчына шпакоўня была гатова, дзяўчынка перастала плакаць. А пасля другой-трэцяй вылецелі з галавы ўсе думкі пра каханне, нібыта качкі ў вырай.

З тае пары заўсёды, калі чарговым разам з-за разбітага сэрца вільгатнелі вочы, Аленка крочыла да дзедавай майстэрні. Хоць у асабістым жыцці ўсё было абы-як, затое выходзілі цудоўныя хаткі для птушак. Няспраўджаныя надзеі адступалі і забываліся, бо, як казаў дзядуля, «праца — найлепшае лякарства!». Хоць, па шчырасці, сам калі-нікалі прымаў «глог» — ад сэрца.

ВЕНІНА РАДАСЦЬ

Веню прыснілася жонка-нябожчыца. Кажа яму ў сне: «Хадзі да мяне, Венечка, харош ужо там бавіцца…». Веня так уразіўся, расчуліўся, што неадкладна закарцела выпіць. Да таго ж моманту Веня ўжо дванаццаць гадоў не піў, і жадання не было. Спраўны вернік, у царкву хадзіў, баптысцкую. А тут на табе ліха: на добрую палову года ў запой праваліўся. Тут бы Веню спытацца самаго сябе пра прычыны падобных сноў. Думаеце, на самай справе жонка з таго свету пагукала? А скулля — гэта гарэлачны д'ябал памятае, якім Веня быў раней, ды бачыць, што не п'е чалавек ужо столькі, ды ўжо ж на пенсіі даўно, вось і спакусіў вобразам жонкі, ведае, куды ткнуць балюча. І Веня піў, спыніцца не мог, пакуль не пачаўся сепсіс. Плямы чорныя пайшлі па ўсім целе. У выніку — рэанімацыя, а затым адрэзалі счарнелую нагу.

Так Веня ледзь не выправіўся ўслед за жонкай, але неяк выкараскаўся, выжыў. Царква, якую ён наведваў, малілася за яго. У Вені ж і без таго было два штучныя клапаны ў сэрцы, а тут у дадатак — сепсіс. Але Бог даў Веню яшчэ час. І зараз Веня радасны, што мае гэты час. І гарэлку больш не п'е, дзякаваць богу. А калі і захоча раптам, складана будзе на адной назе да крамы дасакаць…

Кожны дзень —

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшынёй якога мне выпаў гонар стаць трэці раз запар, было ўтворана 16 снежня 2005 года. На пачатак года МГА СПБ налічвала 332 літаратары, 26 з якіх жывуць за межамі Беларусі. Сярод пісьменнікаў аддзялення — 12 лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі ў галіне літаратуры, архітэктуры і мастацтва, сярод якіх — Уладзімір Ліпскі, Алесь Марціновіч, Мікола Мятліцкі, Уладзімір Скарынкін, Міхаіл Шыманскі, Васіль Шырко ды іншыя. Нацыянальнай літаратурнай прэміяй Беларусі ўганараваны 13 творцаў, у ліку якіх — Уладзімір Саламаха, Дзяніс Марціновіч, Ягор Конеў, Маргарыта Латышкевіч, Казімір Камейша, Вольга Нікольская, Юлія Алейчанка. Пісьменнікі Віктар Шніп, Мікола Маляўка, Валянціна Паліканіна, Вячаслаў Бандарэнка, Мікола Мятліцкі ўзнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Прэміяй Саюзнай дзяржавы адзначана творчасць Івана Юркіна, прэміяй «Зоркі Садружнасці» — Алеся Бадака, Мікалая Чаргінца, Івана Саверчанкі. Больш за 150 літаратараў у свой час сталі лаўрэатамі іншых прэстыжных рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных прэмій.

А як не ўзгадаць, што званнем «Заслужаны дзеяч культуры Беларусі» ўганараваны Уладзімір Вялічка, Міхаіл Шыманскі, Генадзь Пашкоў, Мікалай Чаргінец, Уладзімір Гніламёдаў, Уладзімір Ліпскі, Алесь Марціновіч, Мікола Чарняўскі, Мікола Мятліцкі, званнем «Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі» — Анатоль Дзялендзік, Сяргей Волкаў. Заўважу, што сярод творцаў — 18 дактароў навук, 22 кандыдаты навук.

Многія пісьменнікі маюць дзяржаўныя ўзнагароды. Ордэнам Францыска Скарыны ўганараваны Алесь Савіцкі, Уладзімір Карызна, Уладзімір Ліпскі, Уладзімір Гніламёдаў, Мікалай Чаргінец, Уладзімір Шугля, Анатоль Аўруцін, а 23 пісьменнікі — медалём Францыска Скарыны. МГА СПБ заснавала і ўласныя ўзнагароды: грамата МГА СПБ, Ганаровая грамата МГА СПБ, медаль «Максім Багдановіч». Штогод аддзяленне прысуджае літаратурныя прэміі за найбольш значныя творы. У галіне паэзіі — прэмія імя Максіма Танка, у галіне прозы — прэмія імя Івана Шамякіна, у галіне дзіцячай літаратуры — прэмія імя Янкі Маўра, за лепшы дэбют — прэмія «Адкрыццё года».

Сталічным аддзяленнем створаны і дзейнічаюць пры Доме літаратара, установах культуры і адукацыі сталіцы Школа юнага паэта, Школа юнага празаіка, Тэатр паэзіі, звыш 30 літаратурных клубаў, студый, гасцёўняў. Многія пісьменнікі аддзялення ўзначальваюць таксама літаратурныя аб'яднанні пры ВНУ, Палацах культуры, бібліятэках. Набылі папулярнасць Мінскі гарадскі тэатр паэзіі (дырэктар — Міхась Пазнякоў, мастацкі кіраўнік — Вольга Багушыньска), клуб творчых жанчын «Спадарыня» (кіраўнік — Тамара Бунта), студыя мастацкага чытання «Вобраз» (кіраўнікі — Валянціна Драбышэўская і Наталля Касцючэнка), Школа юнага паэта пры МГА СПБ (кіраўнік — Міхась Пазнякоў), студыя юнага літаратара «Малінаўскія галасы» пры дзіцячай бібліятэцы № 15 (кіраўнік — Іна Фралова). Паспяхова працуюць літаратурнае аб'яднанне «Натхненне» пры Палацы ветэранаў (кіраўнік — Вольга Сакалова), літаратурная гасцёўня «Аўтограф» пры інтэрнаце БДЭУ (кіраўнік — Іна Фралова), а таксама шматлікія іншыя аб'яднанні ды клубы.

У 2011 годзе МГА СПБ заснавала дзве кніжныя серыі «Бібліятэка Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі» (выйшла звыш 40 кніг) і «Мінскія маладыя галасы» (выйшла звыш 30 першых кніг юных літаратараў).

Штогод пісьменнікі аддзялення выдаюць 100—110 кніг. Ад 1500 да 2000 твораў нашых літаратараў кожны год друкуюцца ў вядучых літаратурных выданнях Беларусі, Расіі, іншых краін.

Сярод многіх творчых конкурсаў, якія праводзім сярод дзяцей, падлеткаў і моладзі, варта згадаць «Славянскі калейдаскоп», прысвечаны Дню яднання народаў Беларусі і Расіі. А яшчэ — літаратурныя конкурсы, прысвечаныя юбілеям класікаў беларускай літаратуры, вялікім дзяржаўным святам. Штогод наладжваем гарадскі конкурс чытальнікаў паэзіі Беларусі сярод школьнікаў і студэнтаў.

Праца МГА СПБ інтэгравана ў грамадскае жыццё Мінска. Наладжана плённае супрацоўніцтва з установамі і арганізацыямі культуры, адукацыі, навукі. Цесна супрацоўнічаем з упраўленнем культуры, галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы і па справах моладзі, гарадской арганізацыяй БРСМ. Штогод пісьменнікі аддзялення бяруць удзел у амаль двух тысячах мерапрыемстваў. Кожны год адбываецца больш ад 8 тысяч пісьменніцкіх выступленняў у самых розных аўдыторыях.

У МГА СПБ плённыя творчыя сувязі з пісьменніцкімі арганізацыямі Масквы, Санкт-Пецярбурга, Калінінграда, Цюмені, Дагестана, Калмыкіі, Астрахані, Чачні, а таксама Чарнігава, Кіева. Выступаем сузаснавальнікамі некалькіх міжнародных літаратурных конкурсаў, бяром удзел у міжнародных літаратурных форумах у Расіі, Украіне, Сербіі, Ізраілі. Так, сумесна з Санкт-Пецярбургскім аддзяленнем СП Расіі падрыхтавалі два зборнікі паэзіі і прозы «Неделимое русло». З Цюменскім аддзяленнем СП Расіі — сумесны зборнік твораў ваенна-патрыятычнай тэматыкі «Победители». Творы і нават кнігі нашых пісьменнікаў перакладзены і перакладаюцца на многія мовы свету. А творы нашых замежных калег — на беларускую мову. Так, пабачыла свет кніга вершаў народнага паэта Дагестана Магамеда Ахмедава «Горная ліра», кніга вершаў рускага паэта Юрыя Шчарбакова «Таццянін дзень», кніга вершаў народнага паэта Калмыкіі Эрдні Эльдышава «Песня кавылю».

Міхась ПАЗНЯКОЎ,
старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі

Наталля КАСЦЮЧЭНКА

Мой пясочны гадзіннік

Лірычныя мініяцюры

АДЗІНОЦТВА

Кажуць, што статкавасць патрэбна авечкам. Ільвы ж гуляюць і палююць самі па сабе.

Так і людзі. Час ад часу адзіноцтва патрэбна кожнаму.

Здаецца, што яшчэ хацець ад жыцця, калі табе на нейкі час падорана магчымасць пабыць у чароўнай цішыні. Няхай гэта будзе ва ўтульным пакойчыку за кнігай, альбо ў лесе, на лузе, ці калі ты замілавана глядзіш на зоркі, на залацісты сярпок маладзіка… А яшчэ лепш — на радзіме, пасля расстання. Помню, як адна, надвячоркам, выйшла на бязлюдную сцяжыну за вёску і проста ўглядалася, услухоўвалася ў наваколле, наталяючы сваю самотную прагнасць і тугу. Тады адзіноцтва нагадвала шчасце…

Але чалавек доўга адзін не можа. Большасць людзей шукае зносін. Нават інтэрнэт-прастора даказвае гэта, дэманструючы мільёны віртуальных сяброўстваў і запрашэнняў да знаёмства. Колькі тых, хто не шкадуе часу, абы не адзіноцтва! Хаця адчуваць адзіноту можна і сярод людзей. Я вельмі часта яе адчуваю нават у вялікай кампаніі. А выпадзе пабыць адной — звычайна ўспрымаю гэта з асалодай. Таму не пагаджуся са сваім любімым Экзюперы наконт таго, што «нічога няма на свеце лепшага за чалавечыя зносіны».

Аднак магчымасцю пабыць у адзіноце можа пахваліцца не кожны. На жаль, права на адзіноцтва нярэдка прыходзіцца заваёўваць. Асабліва чалавеку творчаму.

ТВОРЧАСЦЬ

Часцей за ўсё творчасць патрабуе адзіноцтва і паглыблення ў сябе. Асабліва творчасць пісьменніка.

З захапленнем думаю пра Сэлінджэра і стаўлю сабе ў прыклад. Устрывожыўшы свет сваім лаўцом у жыце, сваім Холдзенам, які не цярпеў хлусні, ён схаваўся ад мітусні і ўшанаванняў прыхільнікаў у далёкім Корнішу, на беразе ракі Канэктыкут, у сваім садзе, што быў адгароджаны ад цікаўных вачэй высокім частаколам. Сядзеў ён сярод яблынь і ведаў — лепшая кніга напісана, і напісана ім. І яшчэ быў упэўнены, што ніхто і ніколі ўжо не напіша такой пранізлівай аповесці.

Сэлінджэра больш няма. Але яго «Над безданню ў жыце» засталося.

Напэўна, кожны пісьменнік жадае і плануе напісаць сваю галоўную кнігу, якая растлумачыць усю сутнасць жыцця. Але хіба магчыма напісаць такую кнігу? Такой кнігі не існуе.

Ёсць пісьменнікі, перад якімі я схіляюся, чый талент хвалюе настолькі, што сціскае ў горле, і я нават плачу. Пасля чытання іх твораў вельмі хочацца пісаць самой. Але такая высокая планка зададзена імі… Што ўзнікае боязь белага ліста.

І я збягаю туды, дзе яго няма. Блукаю дзе-небудзь уздоўж леса ці поля і раскідваю словы. І якія словы! Цуд! Душа выплёскваецца праз іх. Але мае словы растаюць ранкам разам з расой. І нічога не застаецца ад іх. Ніхто не вышуквае іх, не чытае, не перакладае.

І тады я разумею, што трэба, абавязкова трэба пісаць, выплёскваць душу праз словы не ў траву, а на паперу. Але зноў боязь белага ліста… Зноў і зноў… Бо вельмі ж высокую планку задалі тыя, чые словы не падуладны часу.

ЧАС

Я спрабавала супрацьстаяць часу, як магла... Праз творчасць, вядома. Калі пераадольвала ўсё ж свае жахі, комплексы, няўпэўненасць у сабе і адважвалася пісаць. Я паўтарала сваё жыццё на паперы, марачы, што яно стане набыткам для іншых і такім чынам дасягне неўміручасці. Імгненні мінулага перажывала наноў, і не менш востра, чым калісьці. Толькі цяпер бачылася і разумелася ўсё інакш, глыбей і, на жаль, трагічней. Бо той жа самы час зрабіў мяне больш сталай і мудрай. Аднак не даў ніводнага шансу што-небудзь выправіць.

Я спадзявалася: той, хто будзе чытаць мае тэксты, таксама пражыве і маё жыццё. Хіба гэта не бессмяротнасць?!!

Якая бязглуздзіца! Самападман! Ліхаманка ад амбіцый! Сваё жыццё пражыць можна толькі самой. І адказаць за яго якасць з часам. А час усё рассудзіць.

Аднойчы ў Калінінградзе ў музеі бурштыну ўбачыла празрысты сонечны каменьчык, у якім застыў мураш. Што загубіла яго? Жаданне самастойнасці? Альбо надакучыла статкавае жыццё? Ён не разважаў, як я, пра бессмяротнасць, а проста, пакінуўшы мурашнік, адправіўся па здабычу і застаўся ў смале. За сваю прагу свабоды расплаціўся жыццём. Я ўглядалася ў гэтага мураша і ўсёй душой шкадавала яго. Хаця нас падзялялі тысячагоддзі.

Вось каму наканавана было атрымаць пасмяротную славу! Таму, хто да яе не імкнуўся.

Час заўсёды быў на варце маёй несвабоды, незалежна, жадала я таго альбо не. А свабоды я прагнула і прагну заўсёды. Як, напэўна, і кожны.

Адчуваю і свой пясочны гадзіннік. Як пясок павольна льецца праз вузкую варонку. Не сыплецца, а менавіта льецца. Радасць існага ў яго бясконцасці. Пясок жа ў маім гадзінніку скончыцца, а ўсё застанецца: і гэта неба, і квецень садоў. Па-ранейшаму будуць свяціць сонца і сумна плакаць дажджы. Толькі без мяне. Немагчыма самой перавярнуць пясочны гадзіннік, каб зноў пачаць адлік.

напружаная праца

Міхась БАШЛАКОЎ

***

Я падніму
Са сцежкі жалудок
З прыгожай шляпкай
Пад плячыстым дубам.
Падумаю:
Такі б вось мне радок —
Трывалы, моцны,
Сэрцу майму любы...

Як жалудок,
Прыкоціцца радок.
А за радком
Прымроіцца і песня,
Што узляціць
Да самых да аблок,
І паплыве
Над сонечным Палессем...

І кружыцца
Над сцежкаю лісток.
На плоце
Серабрыцца павуціна.
І залаціцца
Спелы жалудок,
Як залаціцца
Неба над Айчынай...

Валянціна ДРАБЫШЭЎСКАЯ

Вёсачцы маёй

Вёсачка мая зусім
сагнулася,
Як вярба, самотна ля вады.
Не прыбрана на Вялікдзень вуліца,
Толькі вабяць квеценню сады.

І глядзяць тужліва, па-сірочаму,
Хаткі, запрашаюць на парог.
Салавейка заліваe вотчыну,
Што дабраславіў калісьці Бог.

Прудавіца, мілая, гаротная,
Хоць цябе на карце не знайсці,
Самая надзейная і родная
Ты мая прапіска у жыцці.

Выстаяла мужна пад фашыстамі
Брагіншчыны мілае дзіця.
Рыдыеактыўным пылам знішчаны
Перспектывы светлага жыцця.

Немата. Цнатлівасць. Толькі ў памяці
Ўздоўж гумна бягу я басанож.
Конікі стракочуць, з неба — жаўранкі!
І пляце вясёлку летні дождж.

Вось мая бабуля завіхаецца
Спраўнай гаспадыняй на двары.
Вось ля клуба сельскага збіраюцца
Маладосці вечныя сябры.

Памяць… Прудавіца! Сэрца моліцца!
Радаўніца — свята для цябе,
Бо жывымі поўніцца ваколіца!
Бог дае надзею у журбе!

Вёсачка мая з дзіцячай радасцю
Распрамляе плечы ля вады…
На пяску магільным светлай памяццю
Засталіся родныя сляды…

Сэрца матулі маёй

Вось я маленькая ў смешнай сукенцы
Вісну на плоце ўніз галавой.
— Мамачка! — На дапамогу імкнецца
Сэрца матулі маёй.

Крочу я ў школу з вялізным букетам.
З гонарам ранец нясу за спіной.
Ногі дрыжаць, а далонька сагрэта
Сэрцам матулі маёй.

Моцна хварэю. Ласкавыя рукі
Лечаць, знімаюць нястрыманы боль...
Веру, вядомы любыя навукі
Сэрцу матулі маёй.

Першае... Слёзы, спатканне, каханне,
Вершы... Лунаю-пяю над зямлёй...
Благаслаўляе ўсе пачынанні
Сэрца матулі маёй.

Самае страшнае... У чорнай сукенцы
Нізка схіляюся я над труной...
— Людзечкі, родныя, чуеце! Б'ецца
Сэрца матулі маёй!

...Хоць у жыцці ўсё нялёгка даецца,
З горда паднятай іду галавой,
Бо адчуваю ў сваім сэрцы сэрца —
Сэрца матулі маёй.



Анатоль ЗЭКАЎ

Лета ў вёсцы

Па ваду хаджу
да студні,
паліваю ў спёку грады.
Так мае праходзяць будні,
так мае праходзяць святы.

Стала вёска домам летам,
і зусім мне не самотна.
Тут жыву не як паэт я,
а ў зусім зямных турботах.

Мне тут хораша і ўтульна,
светла так — бы ў храме боскім,
і, як кажуць, не да гуляў,
бо гуляць калі ўжо ў вёсцы?

То сяўба, а то праполка,
то жукі, што з Каларада.
Дзень — бы ў коле тым вавёрка,
і таму, папраўдзе, рады.

Па ваду хаджу да студні,
пустазелле рву на градах.
Іншых мне не трэба будняў.
Для мяне яны — як свята.

Аліна ЛЕГАСТАЕВА

Францыску Скарыне прысвячаецца

То не гукі акарыны,
Не зялёны шум бяроз,
То ў купецкі дом Скарыны
Бусел дзіцятка прынёс.

Навіной звінела далеч,
Адгукаўся рэхам бор.
Сына з любасцю страчалі —
Славу пеў гасподні хор.

Падрастаў юнак. Сваволіў.
Прагнуў слова і навук.
З'еў нямала з хлебам солі
Неба зорнага унук.

Аб'ядналі ўсход і захад
Сцежкі лёсу, кліч багоў.
Полацк — Кракаў, Вільня — Прага
Помняць мужны шлях яго.

Слова. Думка. Вера. Кніга.
Першабіблія славян
З-пад пяра сплывала ціха
У Сусвету акіян.

Гуманіст. Філосаф. Доктар.
Беларускасці Парнас.
Ён і сёння светлым вокам
Сілай слова родніць нас.

Ад глыбіняў усясвету,
Мовы роднае святла,
Па святому запавету
Да сябе і я прыйшла.

Змітрок МАРОЗАЎ

***

Няўжо магу я
здрадзіць,
Змяняць на іншы край
Салоўку ў родным садзе,
За вёскай ціхі гай?

Няўжо мне хопіць сілы,
Адрынуць назаўжды
Палеткаў гоман мілы,
Крынічны звон вады?

Няўжо магу забыцца
На родныя крыжы,
Дзе трэба спаталіцца
Зняверанай душы?

Няўжо спяваць магчыма
Сярод чужых краёў
Без маці, без Радзімы,
Без родных салаўёў?

***

Мне ўсё часцей бярозы сняцца,
Вярба пад матчыным акном,
Палі, дзе хмары табуняцца,
Што зацяжарылі дажджом.

Відаць, таму і настальгія
Маю душу туды заве,
Дзе жарабяткі маладыя
Пасуцца ў ранішняй траве.

Дзе салавей асірацелы
Шукае сэрцу спарыша,
Дзе ў туманах трывожна-белых
Мая згубілася душа.

Мікола МЯТЛІЦКІ

Хойнікі

Тут пад старымі
таполямі
Мележа юныя крокі.
Пахнуць тут лесам і
полем
Белыя ў небе аблокі.

Яснасць блакітнае вышы,
Сонца зіхотна палае.
Годна ўстаялі і выжылі
Ў ядзернай згубы на ўскраі.

Росна ўсміхнецца ваколле,
Голасна ўзбудзіцца ранак.
Тут пад старымі таполямі
Крокі красунь — хайнічанак.

Свет не завабіў рублямі,
Небнай спакуснаю маннаю.
Хлопцаў завуць Васілямі
А прыгажунь юных — Ганнамі.

Лёс непадзельна адзіны,
З шырамі памяці гойнымі.
Светлы ўскраек Радзімы,
Сэрцу адкрытыя Хойнікі.

***

Не высахнуць крыніцы твае, зямля
родная,
Не абязводнеюць плыткія рэкі.
Гады крывавыя, гады галодныя
Адступілі навекі.

І ты, зямля мая, нязломна-мужная,
Яваю сонечнаю красуеш,
Душа твая чыстая, болем асмужаная,
Свету ўсяго трывогі чуе.

Апошнім кавалкам не раз дзялілася
Нават ты і ў агні пякельным,
З ворагам стойка, бясстрашна білася,
Што руляй у сэрца цэліў.

А сёння, красою жывой уквечаная,
Нібыта квяцістым маем,
Шчодрай душою сваёй чалавечаю
Белы свет ахінаеш.

Міхась ПАЗНЯКОЎ

***

Нарадзіўся я ў
сонечнай хаце,
Хлебам, песняй
спавітай, святой,
Абагрэтай рупліваю
працай,
У вялікай сям'і дабратой.

І дубы мне, і клёны шапталі
Казкі-мроі радзімай зямлі.
З першых год мяне з ложка ўздымалі
Промні сонца і ў поле вялі.

Тут, у шчырасці звонкай, вясковай
Вечным скарбам, жывым хараством
Неўміручае роднае слова
У душы назаўжды прарасло.

Тут старанна спасціг на прыволлі
Сэнс жыцця, дух ягоны і соль.
Тут у сэрца ўбіраў я паволі
Спаконвечныя мары і боль…

Хоць і свет прада мною шырокі,
Хоць цяпер тут я госць у радні —
Чую ўсёю душою вытокі,
Чую продкаў сваіх карані.

Тут як сёстры — бярозы і ліпы,
Па душы брэх сабачы мне тут,
І самота калёснага рыпу,
І руплівы, спагадлівы люд.

Край бацькоўскі, чароўны і мілы,
Непаўторны, адзіны, святы.
Тут свае развінаю я крылы,
Тут бясконца шчаслівы заўжды.

Тут, дзе песні спяваю я хлебу,
Дзе бацькоўскі прыняў запавет,
Пакланюся высокаму Небу
І сцяжыне, што вывела ў свет.

***

Зноўку дома пеняцца сады,
Белы вэлюм ахінае хаты,
Вечарам ад рэчкі праз брады
Саванам паўзе туман кудлаты.

Разліваюць трэлі салаўі,
Гояць сэрца цнотнаю пяшчотай,
Месяц з перапоўненай сяўні
Цемру абсыпае пазалотай.

Мілая, радзімая зямля!
Дарагі, жывільны, дзіўны краю!
Толькі тут штоміг шчаслівы я,
Толькі тут душой адпачываю.

І таму і ў шчасці, і ў журбе,
Каб мяне прывеціў і расчуліў,
Я часцей тулюся да цябе,
Як малы калісьці да матулі.

Іна ФРАЛОВА

Мова

Няма дзе прытуліць
мне галаву —
Разбураны мой дом.
Губляю веру.
Абрысы слоў кідаю
на паперу.
Не ведаю жыву ці не жыву.

Найлепей таму краю анямець,
Дзе мову абражаюць недаверам.
Як адмяраем — будзе тая ж мера —
Чужыя песні нашым дзецям пець.

Народзе мой, няўжо сярод людзей,
Табе маўклівым быць і непачутым.
Няўжо табе — мой велічны, славуты —
Жыць вечна без прытулку і надзей?

Мікола ШАБОВІЧ

Роднай вёсцы Бадзені

Толькі ты мне і сілу,
і веру даеш,
Родны край — маіх дум, маіх сноў
прыцяжэнне.
Тут мой верш самы першы імкнуўся
ў бязмеж,
Тут знаходзіла сэрца ад бед суцяшэнне.

Тут спазнаў я крыніц люстраводную
плынь,
Слухаў клёкат буслоў, спеўны свіст
салаўіны.
І калі ахінае марозная стынь,
Сагараваюць мяне дарагія ўспаміны…

Хто б я быў без цябе, мой бадзенеўскі
кут,
Дзе б знайшоў для душы выратоўныя
лекі?
Дзякуй Богу, што я нарадзіўся вось тут
І што гэтай зямлі я адданы навекі.

мастацкія практыкі

Алена РУСАКЕВІЧ

ВІЗУАЛІЗАЦЫІ ФІЛАСОФСКІХ ДУМАК

Беларуская школа графікі заўсёды займала ганаровае месца ў айчыннай і сусветнай мастацкай культуры. І графічныя творы, якія прадставілі выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў на абароне дыпломных работ 2019 года, яшчэ раз пацвердзілі гэты факт. На абароне былі прадстаўлены кніжная ілюстрацыя, станковая і лічбавая графіка.

Асаблівай мастацкай выразнасцю вызначыліся серыя графічных работ Хрысціны Іванцовай «Мова прыродных формаў» (кіраўнік Юрый Хілько), выкананая ў тэхніцы афорта. Мастачка ў сваім творы пераасэнсоўвае батанічныя ілюстрацыі. Яна счытвае мову прыродных форм, трансфармуе яе і стварае мову ўласную, ні на што не падобную. У дыпломнай рабоце распавядае пра тое, што нават устойлівыя навуковыя катэгорыі прадугледжваюць цэлы шэраг інтэрпрэтацый і што нават у самых звыклых рэчах можна ўбачыць глыбокія сэнсы. Кожны графічны ліст Хрысціна Іванцова напоўніла мноствам знакаў і сімвалаў. Яе работа ператварылася ў набор шыфраў і кодаў, які прапануецца разгадаць гледачу. Такім спосабам дыпломніца раскрывае філасофскія паняцці: час, сэнс жыцця і месца чалавека ў свеце.

Заслугоўвае ўвагі таксама серыя афортаў Дар'і Петрусевіч-Кавальчук «Дом» (кіраўнік Валерый Славук), у якой яна разважае пра паходжанне Сусвету. Работа носіць падкрэслена даследчы характар: мастачка з дапамогай творчай дзейнасці вывучае этапы і ўмовы ўзнікнення Сусвету, спрабуе асэнсаваць месца чалавека ў свеце. Актуальнасць гэтай работы не выклікае сумненняў: касмаганічныя тэорыі ва ўсе часы цікавілі гледача. Гэты твор, акрамя эстэтычнай, выконвае яшчэ адну немалаважную функцыю — актуалізацыі пры дапамозе мастацтва складаных навуковых і філасофскіх катэгорый. Дар'я Петрусевіч-Кавальчук прапануе сваю трактоўку гэтай з'явы. Аўтар разглядае працэс паходжання Сусвету як этапы фарміравання так званых «Дамоў» — розных стыхій або першарэчаў, якія складаюць аснову нашага свету.

Нельга не адзначыць серыю літаграфій Маргарыты Дабравольскай «Яднанне» (кіраўнік Андрэй Ярашэвіч), у якой яна дзеліцца ўласнымі разважаннямі пра спосабы знайсці шчасце. У сваёй серыі графічных работ мастачка візуалізуе філасофскую думку, якая вучыць самапазнанню, пошуку гармоніі з самім сабой, спазнання асаблівасцей узаемадзеяння чалавека з навакольным светам. Усімі гэтымі пытаннямі чалавецтва задаецца на працягу многіх тысячагоддзяў, і сёння гэтая тэма застаецца актуальнай для мноства людзей.

Цікавы падыход да стварэння кніжнай ілюстрацыі прадэманстравала Настасся Стальмашонок (кіраўнік Валерый Славук). Яна знаёміць гледача і чытача з уласным бачаннем ідэі і сюжэта казкі Генрыха Сапгіра «Прынцэса і Людаед». Мастачка пераасэнсоўвае сюжэт усім знаёмага з дзяцінства літаратурнага твора, ствараючы новы свет, напоўнены выразнымі персанажамі і яркімі эмоцыямі.

Прадстаўленыя творы былі выкананы на высокім тэхнічным і мастацкім узроўні. Работы атрымалі высокія ацэнкі спецыялістаў і прызнанне публікі.

Фантастычныя рэбусы Георгія Скрыпнічэнкі

Георгій Скрыпнічэнка — першы і самы паслядоўны прадстаўнік беларускага сюррэалізму, чые работы сёння ўваходзяць у залаты фонд беларускай культуры. За апошнія два гады ў Беларусі было арганізавана некалькі выставак майстра, і ніводны праект не паўтарыўся. Цяпер у мастацкай прасторы «Арцель» працуе выстаўка «Міфы і легенды Георгія Скрыпнічэнкі», дзе прадстаўлены работы са спадчыны майстра і прыватных калекцый. Экспазіцыя дазваляе гледачу пазнаёміцца з некаторымі карцінамі, якія не экспанавіліся раней, а таксама са спецыяльнай падборкай графічных работ аўтара.

«На Палессі гоман». 1982—1983 гг.

Выстаўка «Міфы і легенды Георгія Скрыпнічэнкі» атрымала такую назву невыпадкова. Мастак быў чалавекам багемным, эпатажным у мастацтве, але яго асабістае жыццё і ўнутраны свет былі закрытымі ад навакольных вачэй. Менавіта таму вакол асобы аўтара заўсёды было шмат легенд.

Талент мастака праяўляўся ва ўменні рэалізоўваць сябе ў разнастайных жанрах, фарматах і тэхніках. Ён ствараў вялікія цыклы работ, часта вяртаўся да раней напісаных карцін. Не любіў прадаваць іх, а, наадварот, даражыў, як сваімі дзецьмі, бо ўклаў у іх душу.

Мастак пісаў сюррэалістычныя сюжэты, абапіраючыся на беларускую міфалогію і гістарычны кантэкст. Напрыклад, карціна «Выкраданне Еўропы» на выстаўцы прадстаўлена ў трох варыянтах. У партрэце Барбары Радзівіл мы бачым адлюстраванне беларускіх традыцыйных сімвалаў — гняздо, бусел.

— Часта гавораць, што падкрэсліваць сюррэалістычнасць Скрыпнічэнкі — гэта значыць нагадваць пра другаснасць, бо работы мастака сугучныя з творчасцю Сальвадора Далі, — падкрэслівае куратар выстаўкі Ала Зміёва. — Але першыя сюррэалістычныя работы Георгія Скрыпнічэнкі датаваныя канцом 60-х — пачаткам 70-х гадоў. А тады яшчэ не было каляровых рэпрадукцый, я ўжо не кажу пра альбомы Сальвадора Далі. Першы альбом Далі трапіў у рукі мастака толькі ў пачатку 90-х гадоў, менавіта тады ён захапіўся творчасцю іспанскага мастака. Далі стаў праваднікам Георгія Скрыпнічэнкі ў свет філасофскага развіцця. У мастака заўсёды быў шырокі дыяпазон поглядаў. Другой нашай задачай было жаданне паказаць глыбіню і стрыманасць работ мастака, нягледзячы на тое, што візуальна яны вельмі яркія.

У сюррэалістычных творах мастака прыкметныя партрэтныя элементы, у тым ліку аўтапартрэты, адзін з якіх прадстаўлены на выстаўцы. Таксама часта сустракаюцца партрэты ўнутры сюжэта. Часам гэта партрэт галоўнага героя ў сюжэце, а часам маленькая прымайстраваная фігурка. Партрэты іншых людзей, якія прысутнічаюць у творах, у значнай ступені супадаюць з рэальнымі персаналіямі з яго жыцця. Ён не маляваў абстрактных людзей, а выбіраў у якасці персанажаў асоб з яго акружэння. Пры ўсёй яго багатай сюжэтнай фантазіі, ён ніколі не забываў пра рэчаіснасць.

З элементаў рэальных жыццёвых назіранняў, прапушчаных праз прызму ўласнага ўяўлення, мастак ствараў амаль архітэктанічныя вобразы. Некаторыя яго малюнкі мелі асацыятыўны працяг і сталі падставай для стварэння каляровых варыянтаў апрабаванай у чорна-белай графіцы тэмы.

«Вока Божае як авадні». 1965—1993 гг.

— Георгій Скрыпнічэнка не меў акадэмічнай мастацкай адукацыі, але ўзровень яго творчай глыбіні такі, нібыта ён прайшоў усе этапы мастацка-творчага навучання. Мастак — выхадзец са школы Садзіна. Ён наведваў яго студыю, пражываючы ў Слуцку, — расказвае Ала Зміева. — Якраз-такі гэтая студыя спарадзіла такіх вядомых беларускіх мастакоў, як браты Басалыгі, Уладзімір Цэслер… Таму Георгій Сяргеевіч за спінай меў добрую мастацкую базу. Ён скончыў Мінскае мастацкае вучылішча і быў цалкам задаволены сваёй падрыхтоўкай. Лічу, што адсутнасць у аўтара акадэмічнай адукацыі дапамагло яму не абмяжоўваць свой творчы дыяпазон, бо Скрыпнічэнка вядомы як мастак, які займаўся творчымі эксперыментамі. Дарэчы, пасля сябе ён пакінуў значную спадчыну, якая налічвае тысячы твораў.

— Мне здаецца, яго творчасць застаецца недавывучанай пры ўсім яе багацці, — падкрэслівае Ала Зміёва. — Я ўпэўнена, што Скрыпнічэнка — адзін з брэндаў беларускага мастацтва. Прафесійны і непаўторны мастак з узрушальным пачуццём колеру, формы, настрою.

Асаблівай увагі на выстаўцы заслугоўвае серыя графічных работ. Графічныя галаваломкі Георгія Скрыпнічэнкі ўварваліся ў беларускае мастацтва ў 60-х гадах, збянтэжыўшы іншым поглядам на рэчаіснасць. Яго работы былі насычана-дэкаратыўныя і адкрыта эпатажныя для таго часу. Ірэальна-гратэскныя, алегарычныя, з феерверкам вобразаў, яны былі заўважаны гледачамі. Мастак стварыў свет, які не паддаваўся класіфікацыі і звыкламу мастацтвазнаўчаму аналізу. Пры гэтым яго работы сведчылі пра ўменне тонка адчуваць суадносіны лініі і плямы. Георгій Скрыпнічэнка быў захоплены рускім сімвалізмам, паэзіяй Ганны Ахматавай, Зінаіды Гіпіус, Іосіфа Бродскага, Ігара Севяраніна і іншых. Эстэтыка сімвалістаў моцна паўплывала на яго свядомасць. Ён пранікся неабходнасцю абуджаць вобразы, адлюстроўваць не рэчы, а свае ўражанні ад іх.

У творах Георгія Скрыпнічэнкі ёсць не толькі звышрацыянальная чуласць, але і надзвычай тонкае валоданне майстэрствам намёку, каштоўнасць аўтарскай мастацкай мовы — у недагаворанасці, схаваных сэнсах, што надаюць яго работам шматзначнасць і непаўторнасць.

Экспазіцыя «Міфы і легенды Георгія Скрыпнічэнкі» атрымалася цэласнай і дыялагічнай. Дарэчы, пры жыцці мастак ніколі не тлумачыў свае творы, для яго было важным, каб карціны, поўныя метафар і алегорый, заставаліся для гледача фантастычным рэбусам.

Вікторыя АСКЕРА

Аляксандр ГАРЦУЕЎ:

«Расчараванняў у прафесіі не было»

Калісьці яму прадказвалі будучыню матэматыка: хлопчык з маленькай вёскі Сухары, што на Магілёўшчыне, атрымаў у спадчыну вялікія здольнасці лёгка знаходзіць адказы на пытанні падручнікаў. Будучы час саступіў месца цяперашняму, і мы, аматары тэатра, чуем і бачым, што доля даўніх жаданняў усё ж спраўдзілася. Жыццё Аляксандра Гарцуева — заслужанага дзеяча Рэспублікі Беларусь, мастацкага кіраўніка Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі — скрозь прасякнута рэжысёрскімі задачамі, нечаканымі рашэннямі, дзясяткамі роляў, сотнямі гледачоў, бясконцасцю пошуку. А сёлета з'явілася яшчэ адна сур'ёзная лічба — майстра адзначыў 60-годдзе. Вось і нагода. Нас чакаюць за кулісамі…

— Аляксандр Фёдаравіч, юбілей вядомай асобы заўсёды аточаны ўвагай калег, прыхільнікаў, журналістаў. А што дзень нараджэння значыць асабіста для вас? Як адзначаеце свята?

— Шчыра кажучы, з кожным годам святкаваць дзень нараджэння ўсё менш прыемна. У дзяцінстве, у маладосці — так, гэта сапраўдная падзея, ахутаная шматлікімі надзеямі на будучыню. А зараз у мяне хутчэй філасофскае стаўленне да свят: юбілей — добрая нагода паразважаць, прызнацца сабе ў чымсьці, паглядзець, што я паспеў зрабіць… Спадзяюся, ёсць жыццё наперадзе.

— Вы ўзгадвалі, што стаць акцёрам марылі з васьмі гадоў, але сям'я зычыла вам іншую кар'еру…

— Так, я вельмі доўга хаваў ад бацькоў жаданне стаць артыстам — настолькі неверагоднай падавалася мне гэтая ідэя. Аднойчы старэйшая сястра сказала мне радасную навіну: я буду вучыцца ў матэматычным класе (так цудоўна для хлопчыка!). А я і не змог нічога адказаць... Стараўся, атрымліваў добрыя адзнакі і дакладна ведаў, што матэматыка — не мая будучыня. Трэба сказаць, падобных выпадкаў шмат і цяпер: інтуіцыя, жыццёвы і мастацкі досвед мне часта падказваюць, што сілы вымагаюцца дарма, а аргументы, каб гэтага пазбегнуць, знайсці немагчыма.

— У маленстве праца артыста ўяўляецца заўсёднай радасцю, чараўніцтвам, святам. Што руйнавала дзіцячыя ілюзіі?

— З цягам часу прыходзіла больш зямное, аб'ектыўнае стаўленне да прафесіі: пачынаў разумець, што акцёрства — сур'ёзная праца, яна, як і дзейнасць майго бацькі-настаўніка, патрабуе шмат намаганняў. Аднак дыяметральна супрацьлеглага адчування прафесіі не ўзнікала. Руйнаванні адбываліся па-за тэатрам. І найперш гэта тычылася стасункаў з людзьмі, якіх я калісьці лічыў блізкімі сябрамі, — тут расчараванняў хапала… А расчараванне ў прафесіі — не, такога не было. Сам часам дзіўлюся, што, нягледзячы ні на што, захапляюся сваёй справай, як у дзяцінстве.

— У 1980 годзе вы скончылі акцёрскі факультэт Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, а ў 2000 годзе — рэжысёрскі факультэт Расійскай акадэміі тэатральнага мастацтва. Які ён — шлях акцёра да рэжысуры?

— Былі 90-я гады… Цяжкае матэрыяльнае становішча прымушала сур'ёзна задумвацца аб сыходзе з тэатра імя Янкі Купалы, у які я размеркаваўся адразу пасля інстытута. Вырашыў, што пастаўлю на развітанне спектакль па п'есе Змітра Бойкі «Крывавая Мэры» (які, на маю думку, адразу ж павінны былі забараніць), а потым, са спакойным сумленнем, займуся бізнесам… У выніку работа атрымалася вельмі патрэбнай і паспяховай. Пастаноўка была адзначана на многіх еўрапейскіх фестывалях. Аказваецца, калі не баяцца, не абмяжоўваць сябе, можна зрабіць штосьці выдатнае. Гэты выпадак паўплываў на маё рашэнне стаць рэжысёрам. Але не пагаджуся са сцвярджэннем, быццам я змяніў прафесію. Так, з'явіўся новы запіс у працоўнай кніжцы: я афіцыйна стаў рэжысёрам Купалаўскага. Аднак яшчэ доўга мне даводзілася працаваць на сцэне і ў якасці акцёра. Разумееце, акцёрства і рэжысура — складнікі адной прафесіі, якая называецца «тэатр».

— Акцёрскі досвед, напэўна, моцна дапамагае ў рабоце з артыстамі?

— Безумоўна! Рэжысёр мусіць судакранацца з дзейнасцю і драматурга, і кампазітара, і мастака, і грымёра, але ўсе намаганні дарэмныя, калі рэжысёр не змог зрабіць галоўнае — перадаць трупе сваё бачанне п'есы. Я перакананы, што рэжысурай павінен займацца чалавек з акцёрскім мінулым. Ведаеце, рэжысёру важна разумець складаную прыроду акцёра. Разуменне гэтае дапаможа і падказаць, і нават паказаць патрэбны рух, дэталь. Артыст шмат выпрацоўвае, нараджае самастойна, але часам не хапае дробязі — апошняй рысачкі… Неверагодна складана апісваць эмоцыю словамі. Іншая справа — прапусціць эмоцыю праз сябе і прадэманстраваць яе акцёру — чалавеку тонкаму, пачуццёваму, які адразу ж усё схопіць.

— Вы неяк сказалі, што рэжысура вучыць быць адкрытым, цярплівым, паблажлівым да чалавечых хібаў. Але што, на вашу думку, у адносінах паміж рэжысёрам і акцёрам застаецца недаравальным?

— Бяздарнасць. А яна існуе. Нізкі мастацкі палёт я бачыў на свае вочы. Калі так — моўчкі мяняю задачу, раблю яе прасцейшай. Гэта вельмі балюча. Крыўдна. Прыкра. Яшчэ я не разумею такога стаўлення: чалавек сам цудоўна ведае, што ў яго няма таленту, а ён усё адно імкнецца «чытаць тэксты на памяць» — на сцэне ж не трэба ведаць фізіку і хімію… Чалавек мастацтва мусіць быць адораным, духоўным, з уласным разуменнем жыцця. Вось як прыняць бяздарнасць? Тое ж тычыцца і п'ес, якія стосамі прыходзяць у РТБД. Вы пытаеце, чаму да сцэны даходзяць адзінкі, якія памылкі дапускаюць драматургі? Адказ той жа. Графаманства, няздатнасць, безгустоўнасць — недаравальныя рэчы ў мастацтве.

— У 2012 годзе вы занялі пасаду мастацкага кіраўніка РТБД. Якія новыя якасці трупы вылучыліся за гэты час? Якія здзіўленні?

— Трупа РТБД вызначаецца апантанай працаздольнасцю — я кажу гэта як чалавек, якому давялося сустракацца з рознымі калектывамі і ёсць з чым параўноўваць. А яшчэ нашы артысты здзіўляюць мяне адсутнасцю… цынізму. Цынізм у тэатральнай сферы сустракаецца ўсюды, і часам ён нават зразумелы: натуральна, што ў голасе падманутага, зняважанага акцёра могуць прагучаць ноты пагарды. На вялікае шчасце, у сваёй трупе я гэтага не чую.

Увогуле, мастацкаму кіраўніку неабходна ўмець дамаўляцца з калегамі. Напрыклад, я ведаю дакладна, што акцёрам нельга забараняць здымацца ў кіно, інакш яны проста сыдуць з РТБД. Для людзей, чые заробкі ў тэатры вельмі сціплыя, здымкі, удзел у канцэртах — вялікая падмога. Навошта пазбаўляць магчымасці? Патрэбна проста правільнае планаванне: акцёры загадзя паведамляюць аб сваім ад'ездзе, а я, у сваю чаргу, карэктую рэпетыцыйны працэс. У выніку нічога не збіваецца і ўсе адно аднаму ўдзячныя за паразуменне. Так крыўдна, што ў некаторых тэатрах праз недарэчныя забароны артысты губляюць свае працоўныя месцы.

— Пытанне грашовых сродкаў, якое закраналася вышэй, застаецца слушным для ўсіх сфер мастацтва. Калі б не адвечная праблема фінансавання, што немагчыма было б убачыць на сцэне РТБД?

— У нас было б менш простых, даступных, легкадумных меладрам і камедый, якія заўсёды хутка прадаюцца. Ведаю, што прасунутая публіка асуджае такія пастаноўкі, але каб паставіць сур'ёзную, вялікую, у нечым эсперыментальную работу, патрэбны вялікія ўкладанні. Мы вымушаны прадстаўляць касавыя спектаклі. Вядома, тэатр мусіць вучыць гледача суперажываць і думаць, аднак забаўляльную функцыю мастацтва таксама ніхто не адмяняў. Галоўнае — і ў нізкім жанры не забывацца на густ.

— Напрыканцы тэатральнага сезона гледачы РТБД пабачылі прэм'еру спектакля «Сірожа» па п'есе Юліі Чарняўскай. Чаму звярнуліся менавіта да гэтага твора? Якія рэжысёрскія здабыткі атрымалі падчас працы?

— П'еса Юліі Чарняўскай мне вельмі блізкая і зразумелая: апісаныя тыпажы, характары, бытавую атмасферу я сустракаў у гады свайго юнацтва. Нездарма жанр пастаноўкі вызначаны як «жыццё ў дзвюх эпохах». Спачатку мы трапляем у 1980 год. Стасункі, моладзь, студэнцкі інтэрнат, за вокнамі якога віруюць вялікія савецкія падзеі… Праходзіць трыццаць два гады — і нашы ўжо сталыя героі сустракаюцца ў іншай эпосе і краіне.

«Сірожа» — напэўна, мая самая маштабная работа ў РТБД: у спектаклі ўдзельнічае амаль увесь акцёрскі склад, а сама пастаноўка доўжыцца больш за тры гадзіны. Пэўныя цяжкасці ўзнікалі з падборам артыстаў, бо адных і тых жа персанажаў мусілі сыграць розныя людзі — так патрабаваў узрост герояў. Але рашэнні знойдзены, і спектакль-настальгія рыхтуецца выйсці на сцэну.

— Вы неяк прызнаваліся, што ў юнацтве горача абяцалі пазбягаць выкладчыцкай дзейнасці. Заходзячы наперад — не атрымалася?

— Прыкладна ў той жа час, як я пачаў займацца рэжысурай, мяне запрасілі выкладаць у Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. Згадзіўся лёгка — а чаму б і не? У юнацтве я сапраўды даваў клятвы ніколі не кранацца рэжысёрскай справы і не працаваць са студэнтамі. Магу сказаць, што гэтыя абяцанні былі абумоўлены простай стомленасцю ад вучобы і яшчэ не надта глыбокім разуменнем прафесіі.

— Алег Табакоў казаў, што ў любімых вучнях настаўнікі бачаць сябе…

— Сапраўды. Часам сустракаюцца тэмпераменты, падобныя да майго, а часам студэнты навяваюць роздум: што я зрабіў бы інакш, калі можна было б вярнуць маладосць… Сённяшняе пакаленне драматычных акцёраў асаблівую ўвагу ўдзяляе фізічнай падрыхтоўцы, пластыцы, вакалу. У наш час, здаецца, такія кірункі былі развіты менш. Таксама я з усцешнасцю бачу, што ў некаторых маладых людзей ёсць вельмі сур'ёзная мэтанакіраванасць і трываласць. Напэўна, гэтага мне больш за ўсё не ставала ў юнацтве. Але іх — моцных — адзінкі.

— Часам правал спектакля тлумачыцца тым, што публіка яшчэ не падрыхтаваная — «не дарасла» да падобнага матэрыялу. Як ставіцеся да такіх выказванняў?

— Тэатр прадугледжвае наяўнасць гледача, так? Рэжысёрскі талент узрушае чалавека, прымушае пакутаваць, рыдаць, смяяцца. Рэжысёрская бяздарнасць пакідае чалавека халодным. Усё вельмі проста. Я згодны, немагчыма падабацца ўсім. Тым больш што і сёння хапае людзей, якія прысутнічаюць на спектаклі не па сваёй волі. Аднак грамадскае меркаванне, грамадскае прызнанне — вельмі важныя складнікі для тэатральных дзеячаў. Памятайце, тэатр — мастацтва, якое дзейнічае толькі тут і толькі цяпер. Немагчыма падрыхтаваць пастаноўку для будучых пакаленняў. Таму паспяховы спектакль — той, пра які мноства асоб скажа сёння: «Так цікава!». А за размовамі пра непадрыхтаванасць публікі да складанага матэрыялу лёгка схавацца хлусні, штучнай глыбіні, мудрагелістасці, якія прыкрываюць той самы грэх — бяздарнасць… Нядаўна бачыў статыстыку, якая сведчыць, што ў тэатр ходзіць толькі шэсць працэнтаў насельніцтва. Не варта спадзявацца на недасведчанасць гэтай групы.

— А які апошні мастацкі твор прымусіў вас засмяяцца?

— Фільмы Таранціна. Гумар і розум — выдатнае спалучэнне!

— А заплакаць?

— Моцарт. Захапляюся гэтым кампазітарам усё жыццё. Нядаўна пераслухаў некаторыя творы — як і заўсёды, эмоцый безліч! На маю думку, музыка — гэта дасканалае мастацтва: ні колеру, ні тэксту, асацыяцыі аддаленыя, неакрэсленыя, а перажыванне выклікае катарсічнае. Дзіўна. А наконт слёз магу дадаць: яны — цудоўныя сведкі. Калі гледачоў расчуліла тая ж сцэна, што і мяне, — значыць, я не памыліўся, па-рэжысёрску выканаў усё правільна. Магчыма, таму я крыху іранічна адгукаюся пра забаўляльнасць тэатра. Бачыць Бог, няцяжка яна дасягаецца. Куды цяжэй дасягнуць сэрца чалавека… Эмоцыі — найбуйнейшы здабытак тэатра.

Марыя СТРАХ

Нямыя фільмы яшчэ актуальныя?

На мінулым тыдні завяршыўся VII open-air фестываль нямога кіно і сучаснай музыкі «Кінемо». На працягу пяці вечароў ва ўнутраным дворыку музея-майстэрні З. І. Азгура дэманстраваліся нямыя фільмы класікаў сусветнага кінематографа, агучаныя сучаснымі беларускімі і замежнымі музыкантамі і кампазітарамі. Цікава, чаму і хто сёння выбірае прагляд нямога кіно? Дзеля гэтага я наведала некалькі паказаў і гатова вам усё распавесці.

Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, на кожным фестывальным паказе свабодных месцаў не заставалася. Зрэшты, выраз «хто не паспеў, той спазніўся» да «Кінемо» не адносіцца: тут рады былі ўсім і заўсёды, а яшчэ лепш, калі вы прыходзіце са сваім кілімком, на якім можна зручна размясціцца на лузе ў панадворку музея. «Кінемо» насамрэч неверагодна рамантычны фестываль: нямое кіно, жывая музыка, прырода, заход сонца, пледы і гарбатка ў тэрмасе.

Сёлета фестываль паспеў паказаць нямое кіно ў Мінску, Магілёве і Гродне. Кампазітарамі, чыя музыка гучала падчас паказаў фільмаў, выступілі не толькі айчынныя музыканты, але і замежныя — з Германіі і Польшчы.

Нязменныя арганізатары фестывалю — праект *Cinemascope*, Асацыяцыя маладых беларускіх кампазітараў і Мемарыяльны музей-майстэрня Заіра Азгура. Каб даведацца больш аб аўдыторыі фестывалю і актуальнасці нямога кіно ў сучасным свеце, пагаварылі з адным з арганізатараў «Кінемо» Георгіем Глікам.

Георгій умоўна падзяліў гледачоў фестывалю на тры катэгорыі. Першыя — тыя, хто прыходзіць у пошуках нязмушанай і прыемнай атмасферы, да гэтай групы можна аднесці закаханыя пары, якія хочуць правесці вечар рамантычна. Да другой катэгорыі адносяцца людзі, якіх прыцягвае акадэмічная музыка, — іх цікавасць да фестывалю мае падставы з улікам таго, што фактычна ўсе музыканты маюць акадэмічную адукацыю, а для кожнага фільма спецыяльна пішуць музыку прафесійныя кампазітары. І трэцяя «каста» — прыхільнікі кінематографа, яго гісторыі. Гэта самыя захопленыя гледачы.

Тут звычайна шмат моладзі, але людзі шаноўнага ўзросту таксама наведваюць фестываль, ды яшчэ і дзяцей прыводзяць.

XXI стагоддзе, у кіно і серыялах з дапамогай камп'ютарнай графікі адраджаюць драконаў і ствараюць бітвы неверагодных маштабаў. Чаму ж тады нямое кіно застаецца актуальным для сучаснага гледача?

— Таму што з гадамі нямое кіно ўсё больш набывае статус класікі, а яна заўсёды актуальная, — дае адказ Георгій. — Правільна кажуць, што не ведаючы гісторыі, нельга тварыць будучыню. Гэта значыць, без ведаў аб гісторыі кіно нельга ствараць сучасны кінематограф, таму што фактычна ўсе прыёмы мантажу і акцёрскага кінамастацтва зарадзіліся ў той час, і мы іх бачым у старых фільмах. Існуе тэорыя пра тое, што мастацтва мантажу было страчана са з'яўленнем гукавога кіно. Словы сталі вымаўляцца, іх ужо не трэба было неяк паказваць.

Падчас фестывалю я наведала паказ фільма «Горная кошка» рэжысёра Эрнста Любіча. Сучасную музыку да гэтага нямога фільма напісала польская кампазітар Аляксандра Хмялеўская. Увесь фільм жа — дзёрзкая камедыя ў галоўнай ролі з жанчынай-вамп таго часу Полай Нягрэй, якую любіў Чарлі Чаплін. У яе быў закаханы Рудольф Валянціна, а Сара Бернар прызнала Полу сваёй пераемніцай. Пола Нягрэй у «Горнай кошцы» сыграла незвычайную для яе камедыйную ролю. І, улічваючы, што сярод сучасных гледачоў не сціхалі смяшкі, сваю працу актрыса зрабіла добра. Але цяперашняму гледачу за гэтым багаццем смеху і занадта экспрэсіўнай на сучасны погляд манернасцю ў акцёрскай ігры можа падацца, што нямое кіно не дастаткова сур'ёзнае. У гэтым мяне разупэўніў Георгій:

— Справа ў тым, што такая акцёрская работа з доляй блазнерства была абумоўлена неабходнасцю паказаць у кадры адрозненне кіно ад фатаграфіі. Тады існавалі традыцыйныя прылады, якія паказвалі фатаграфію на вялікім экране, накшталт нашых дыяпраектараў. Для разумення, што гэта жывая карцінка, неабходна было больш рухаў і экспрэсіі, каб гледачы бачылі — гэта фільм. У 20-я гады мінулага стагоддзя ад гэтай тэндэнцыі сталі адыходзіць. Калі мы ўжо глядзім нямецкае або савецкае кіно, то там амаль няма манернасці. Напрыклад, «Браняносец "Пацёмкін"», у ім ёсць утрыраваныя вобразы, якія выкарыстоўваюцца ў тэатры, то бок буржуа павінен выглядаць пэўным чынам, але блазнерства няма. Дваццатыя гады — гэта залаты век нямога кіно, таму што з'явілася шмат добрых акцёрскіх і рэжысёрскіх работ, а мода на «крыўлянне» ўжо прайшла. Па-глядзіце «Страсці Жаны д'Арк» — там вельмі трагічныя вобразы, у кінакарціне зняліся выдатныя тэатральныя акцёры.

Цяперашняму гледачу за багаццем смеху і занадта экспрэсіўнай на сучасны погляд манернасцю ў акцёрскай ігры можа падацца, што нямое кіно не дастаткова сур'ёзнае.

Што думаюць гледачы пра нямое кіно, трэба спытаць найперш у іх саміх. Малады хлопец Аляксандр глядзіць нямы фільм ужо не першы раз:

— Нямое кіно выглядае больш жыва, чым сучаснае. Няма слоў, а таму больш шчырыя эмоцыі, усё зразумела толькі па выразу твару артыста.

Жанчына па імені Вольга ўпершыню прыйшла на паказ нямога кіно:

— Я неверагодна ўражана! Асабліва спадабалася спалучэнне візуальнай часткі і музыкі, якую падабралі спецыяльна для фільма. У кожнага сюжэта свой матыў з пэўным настроем, гэта вельмі дапамагае ўспрыманню. Думаю, нямое кіно — гэта асаблівае мастацтва. Нават калі ў свеце ўсё так хутка развіваецца, мне здаецца, важна вяртацца да вытокаў.

Кадр з фільма «Горная кошка».

Улад працаваў на пляцоўцы «Кінемо» на працягу ўсяго фестывалю, частаваў гасцей глінтвейнам:

— Думаю, цяперашняя моладзь больш цікавіцца такімі плынямі, чым людзі старэйшага ўзросту. Хоць некаторыя маладыя людзі прыходзяць, таму што модна, а іншыя глядзяць, таму што гэта даступна і можна адкрыць для сябе нешта новае. Сярод гледачоў фестывалю шмат людзей мастацтва, большасць гасцей размаўляе на беларускай мове, што мяне здзівіла. Маё знаёмства з нямым кіно, напэўна, як у многіх, пачалося з Чарлі Чапліна. Я яго бачыў даўно і не з'яўляюся прыхільнікам. Тут мы прытрымліваемся камерцыйнай цікавасці, але паралельна глядзім фільмы. Чым больш глядзіш, тым больш чагосьці знаходзіш для сябе, для пашырэння кругагляду.

Калі чалавек прыходзіць першы раз на нямое кіно і не дастаткова разумее, што гэта такое, то наўрад ці здолее ацаніць гэтую імпрэзу належным чынам. Фільмы доўжацца па часе столькі ж, колькі ідзе і звыклае для сучаснага гледача кіно. Акрамя таго, да такога кінамастацтва трэба прывыкнуць. Ёсць пэўная спецыфіка гукавога суправаджэння. Безумоўна, гэта прыгожа, але часам складана ўспрымаць без падрыхтоўкі, гэтую культуру трэба прывіваць паступова.

Наталля ВАВІЛОНСКАЯ

давайце паглядзім

Крыху Францыі ў сярэдзіне лета

Калі фільм быў у праграме Канскага кінафестывалю — гэта ўжо своеасаблівы знак якасці. Нават не важна, ці адзначаны ён галоўным прызам — «Залатой пальмавай галінкай». А французска-бельгійская карціна «Спакуса», прынамсі, сёлета была на яе намінавана. Цяпер ёсць магчымасць паглядзець стужку ў Беларусі — з 18 ліпеня ў межах праекта «Лістапад. Калекцыі» ў некаторых сталічных кінатэатрах.

«Спакуса» — стужка рэжысёра Жусцін Трые, якая даследуе жаночую натуру. Прыхільніца Вудзі Алена, яна мэтанакіравана працавала ў гэтым кірунку, стварыўшы некалькі фільмаў. На гэты раз галоўная гераіня Трые — Сібіл, паспяховы псіхатэрапеўт, але яна хоча адмовіцца ад практыкі, каб увасобіць даўнюю мару — напісаць кнігу. У той момант, калі ёй будзе так патрэбна натхненне, побач апынецца юная актрыса Марго, якая шукае дапамогі і падтрымкі. Сібіл, зачараваная новай пацыенткай, стане паглыбляцца ў чужую гісторыю, а яе ўласнае жыццё тым часам перавернецца з ног на галаву. Але ва ўсіх неспадзяваных варунках галоўнае — не страціць сябе…

«Спакуса» — выдатны прыклад, калі ў карціне спалучаецца мастацкасць фестывальнага кіно і імкненне да шырокай публікі. На гэта працуюць і артысты, занятыя ў карціне: Віржыні Эфіра і Адэль Экзаркопулас, вядомая па фільме «Жыццё Адэль», папулярны сучасны французскі акцёр Гаспар Ульель. Разам з рэжысёрам яны стварылі па-французску вытанчаную псіхадраму, якую варта глядзець на вялікім экране.

Валерыя АСІПЕНКА

ведай нашых!

Куды прыводзяць мары

Мультыплікацыйная карціна «Лепшае месца ў свеце» будзе прадстаўляць Беларусь на прэстыжным Міжнародным фестывалі анімацыйнага кіно ў балгарскай Варне. Фільм Ірыны Тарасавай за 13 хвілін распавядае пра юнае мышаня, якое натхнілася цудоўным паданнем пра чароўны свіран, заўсёды поўны зерня, і адпраўляецца на пошукі месца, дзе мышы жывуць без клопатаў. Сцэнарый Канстанціна Андрушачкіна, мастак фільма — Галіна Емяльянава, кампазітарам стаў Аляксандр Ліберзон.

Карціна створана на Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», дзе Ірына Тарасава працуе з 2008 года. Яе анімацыйныя работы ўжо атрымлівалі ўзнагароды міжнародных фестываляў. Напрыклад, фільм «Лыжка для салдата» адзначаны прызам «Залаты Віцязь» і дыпломам «За лепшы анімацыйны фільм для дзяцей» на XXIV Міжнародным кінафоруме «Залаты Віцязь». На XIX Кубанскім фестывалі праваслаўных фільмаў «Вечавы звон» яго назвалі «Лепшым дзіцячым фільмам» у адпаведнай намінацыі, а на VI Міжнародным кінафэсце ў Нью-Дэлі прызналі «Лепшым анімацыйным фільмам».

Міжнародны фестываль анімацыйнага кіно ў Варне з'яўляецца адным з пяці найбольш значных у свеце сярод фэстаў у гэтым відзе кінамастацтва. Ён арганізаваны пад патранатам Міжнароднай асацыяцыі анімацыйнага кіно *ASIFA*.

Марыя АСІПЕНКА

Тэрменвокс: шэпт чуецца на адлегласці

Чароўны, мілагучны, жудасны, дзіўны, магічны, агідны, тонкі, загадкавы, няўлоўны, пяшчотны… Не, гэта не ўрывак са слоўніка эпітэтаў, а кароткі пералік якасцей, што адгукнуліся на добра пастаўлены голас савецкага фізіка-акустыка Льва Тэрмена, на яго сумненне і гонар — тэрменвокс.

За сто гадоў існавання інструмент паспеў шмат: хваляваў даследчыкаў, спрабаваў сілы ў кіно, смакаваў славу *The Beatles, Led Zeppelin, Rammstein*, смуткаваў са *Sting*… Хіба пералічыш усе зоркі на зямлі? А на небе? Тры, два, адзін — і паляцелі запісы тэрменвокс-канцэрта на спатканне з шасцю сузор'ямі. Падумаць, Вялікая Мядзведзіца слухае «Вакаліз» Рахманінава… Але што космас — і да зямнога слухача мастацтва мусіць ісці праз церні. Нягледзячы на сапраўды сусветную вядомасць, знешнасць электрамузычнай вынаходкі ўсё адно палохае, бянтэжыць, цягне няўпэўненае: «Тэрмен… тэрмен… што?» Мажліва, гэтае пытанне, як і іншыя варыяцыі зваротаў, скарае вар'яцкае памкненне: страціць сябе, выкараніць, спаліць, выдаліць — згубіцца назаўжды. Загінуць, каб нарадзіцца адказам. Тым самым, якога шукае чалавек. Чалавек без тэрменвокса.

Музыка — максімаліст: яе веданне асобы не змяшчае прагалаў. Дзе чалавечы боль, дзе спакой, дзе спадзеў — усё чуе, усё разумее. Разумее музыка і тое, што лёс часам легкадумна (а можа, наадварот, разлічана і пакутліва?) аддае галоўную ролю выпадку. Адтуль і парадоксы: Леў Тэрмен зрабіў адкрыццё — унікальны музычны інструмент — не ў пецярбургскай кансерваторыі, якую з поспехам скончыў, а ў фізіка-тэхнічным інстытуце, куды малады Тэрмен зусім не выпадкова быў запрошаны на працу. Музыка не вораг лічбам, віяланчэльнае аддзяленне не сапернік фізіка-матэматычнаму факультэту: Леў Сяргеевіч адначасова спасцігаў дзве, як прынята лічыць, далёкія прафесіі.

Так, тэрменвокс прыдумала не гора, не ўмоўны лад няспраўджанага, не балючае шуканне музы, не яе таемная блізкасць. Інструмент нараджаўся на магнітным полі, пад святлом катоднай лямпы ды з электрычнымі хістаннямі — частаты пераменнай, частаты пастаяннай. Крыўдна? Празаічна? Але ж стасункі з тэрменвоксам — заўсёдная паэзія. Далікатнасць, асцярожнасць, тонкасць, памножаныя на забарону дакрануцца. Іграна тэрменвоксе (без пафасу) не мае сабе падобных.

І няхай не пужаюцца тыя, хто калісьці не прыняў цяжкія ўмовы задач па фізіцы: адносіны з тэрменвоксам — што ўдалая рыфма да адносін з людзьмі. Усё вызначае адлегласць — паміж імі і вамі, вамі і крыніцай музыкі. Так пачынаецца мелодыя. Яе характар — у прамой залежнасці ад характару вашых жэстаў: шчыльны гук коціцца з перадплечча, вытанчанасць хаваецца ў запясці і пальцах. Мо ўсё ж «не рубіць з пляча»?.. Гучнасць нот зноў жа адбірае даўжыня: чым бліжэй рука выканаўцы знаходзіцца да паверхні тэрменвокса, тым цішэй становіцца голас інструмента. Знаёма? Шэпт не чуецца ў далечы… Тэрменвокс пільна сочыць за кожным рухам свайго майстра: ледзь заўважная дрыготка, хістанне, паварот цела, нават кароткі ўздых — найменшая змена ў паводзінах выканаўцы — і шчымлівае ваганне паветра імкліва знікае. На памяць — толькі фальш. І як вярнуць пакрыўджаную каштоўнасць? Здаецца, нядрэнная выява дзвюх патрэбных адна адной постацей… Разам з тым здабытак Тэрмена не абмяжоўваецца нервовасцю ды пачуццёвасцю. Пэўна, галоўная моц інструмента — у яго дыяпазоне: тэрменвокс ахоплівае восем актаў! Вось яна, дасканаласць вакаліста. Ні навучыць, ні перадаць.

А ўдасканальваць вынаходніцтва Льва Тэрмена імкнуліся многія. Так, дзякуючы намаганням амерыканскай выканаўцы Клары Рокмар — адной з першых вучаніц Тэрмена, была палепшана тэхніка гукавылучэння, што дазволіла ўключыць у рэпертуар тэрменвокса шэдэўры класікі. Яшчэ адзін паслядоўнік Льва Тэрмена — Канстанцін Кавальскі — стваральнік новых відаў электрамузычных інструментаў. Да азіяцкіх земляў работа Тэрмена дайшла ў выглядзе прыдуманага японскім майстрам Масамі Такеучы матроміна — тэрменвокса, схаванага ў матрошку. І іграць на ляльцы-інструменце прынята ў ансамблі, дзе колькасць удзельнікаў — сотні. Уражвае? Асабліва калі ўспомніць паходжанне музычнай прылады…

У беларускім музычным свеце тэрменвоксы прызвычаіліся захоўваць уласнае сола. Звычка добрая. Шкада толькі рэдкая. Музычная электроніка знаходзіла

слухачоў на розных пляцоўках: на вуліцы, радыё, у музеі, гандлёвых цэнтрах, арт-галерэях, студыях тэлеканалаў. Геаграфія, пройдзеная многімі інструментамі. Толькі для адных — гэта варыянты альтэрнатыўныя, а для іншых — адзіныя…

Этапнай падзеяй для вандроўніка-тэрменвокса стаў спектакль «З жыцця насякомых», пастаўлены Святланай Бень і Дзмітрыем Багаслаўскім. Музыка, напісаная Валерыем Воранавым, зрабіла «голас Тэрмена» паўнавартасным героем, а інструмент — прафесійным акцёрам, пра якога даведаліся ўсе аматары міжнароднага тэатральнага фестывалю «ТЭАРТ-2016». Пасля пастаноўкі «супрацоўніцтва» тэрменвокса і Святланы Бень прадоўжылася: інструмент аздобіў творчасць гурта «Срэбранае вяселле».

Апошнім часам яшчэ адным месцам, адкрытым для касмічнага тэмбру, сталі сакральныя для многіх беларусаў сцены архікатэдры Імя Найсвяцейшай Панны Марыі. Пад святымі скляпеннямі ўсталявалася цудоўная традыцыя: упрыгожанне электрагукамі, знаёмства вернікаў з творамі маладых беларускіх кампазітараў: Вікторыі Спарыш, Вольгі Падгайскай, Віктара Кісценя, Андрэя Цалко, Вячаслава Пяцько, Алены Гуцінай, Кацярыны Шымановіч. І пошук, і эксперымент, і такая чаканая для ўсіх падтрымка… Маладое сяброўства мацнее і пашырае межы: артысты толькі-толькі вярнулася з пінскага арганнага фестывалю.

Таксама беларускія прыхільнікі тэрменвокса, напэўна, памятаюць фестываль «Мінская вясна — 2017», калі на сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі гучаў Дзяржаўны камерны аркестр Рэспублікі Беларусь разам з галоўным героем гэтага тэксту. Фундамент быў закладзены трывалы — і сёлета тэрменвокс узяў удзел у цыкле канцэртаў «Беларускі арганны фэст». Сцэна філармоніі зрабіла трапнае абагульненне: сачыненні ўжо згаданых маладых кампазітараў перакрыжоўваліся з бессмяротнай творчасцю Іагана Себасцьяна Баха, Каміля Сен-Санса, Гаэтана Клерамбо, Георга Тэлемана, Карла Бёльмана; а ў прывабным радку з прозвішчамі выканаўцаў, сярод якіх ёсць і Ігар Алоўнікаў, і Уладзімір Неўдах, і Ксенія Пагарэлая, з'явіўся надпіс: «Арцём Атрашэўскі (тэрменвокс)» — імя чалавека, які пранёс свой інструмент па ўсіх узгаданых прыступках .

Блізкасць з прызнаным, хочацца верыць, здольная на цуд фізікі — і цікавасць да дзіўнага інструмента стане канстантай.

Марыя СТРАХ

Народны лейтматыў і джазавая «чартаўшчына»

«Камедыя» ў музычным тэатры

На пачатку ліпеня Музычны тэатр парадаваў сваіх гледачоў чарговай прэм'ерай — музычнай версіяй упадабанай беларускай публікай «Камедыі». П'еса ўжо больш за трыццаць гадоў запатрабавана драматычнымі тэатрамі краіны і мае некалькі сцэнічных версій. Лібрэта да музычнага спектакля напісаў Анатоль Зэкаў па п'есе Уладзіміра Рудава.

Дзеянне «Камедыі» разгортваецца ў сучаснай вёсцы. Гэта гісторыя-прытча пра Дзёмку, яго жонку Маланку, яўрэя Давіда і Чорта. Селянін Дзёмка вінаваціць ва ўсіх сваіх пакутах першага чалавека — Адама, бо менавіта за яго грэх цяпер трэба расплачвацца людзям. Каб пазбавіць Дзёмку ад цяжкага жыцця, Чорт прапануе селяніну грошы, але не проста так, а за выпрабаванне чалавечай сілы і волі.

Музыку да спектакля напісаў беларускі кампазітар Алег Хадоска, ужо вядомы гледачам тэатра па некалькіх пастаноўках. Ён жа прапанаваў ідэю спектакля

кіраўніцтву тэатра.

Кампазітар распавядае: «Персанажаў у спектаклі ўсяго чацвёра, таму неабходна было з дапамогай музыкі дасягнуць максімальнай выпукласці вобразаў. Героі падзелены на тры групы, для кожнай з якіх характэрна свая стылістыка. Да першай групы адносяцца Дзёмка і Маланка, для іх характарыстыкі выкарыстана музыка, стылізаваная пад народную. Другая група — Чорт, чый вобраз вырашаны ў джазавай манеры. Да трэцяй групы належыць Давід, музычны вобраз якога насычаны яўрэйскімі інтанацыямі».

Спачатку планавалася зрабіць пастаноўку спектакля на камернай сцэне з шасцю музыкантамі. Аднак пазней усё ж удалося перанесці дзеянне на вялікую сцэну і выкарыстоўваць камерны аркестр, які ўключае струнную групу інструментаў, два сінтэзатары, ударныя інструменты, трубу, кларнет і бас-гітару.

Партытура «Камедыі» стваралася вельмі хутка, усяго за некалькі месяцаў. Кампазітар жартуе: «Я чалавек лянівы, таму даводзіцца шмат працаваць. Мне хочацца хутчэй усё зрабіць і адпачываць. Але адпачываць не атрымліваецца, таму што трэба прыступаць да новага твора».

22 ліпеня Беларускі дзяржаўны музычны тэатр запрашае на другі прэм'ерны паказ спектакля, на якім публіка зможа адчуць атмасферу беларускай вёскі, убачыць Чорта, які спявае джаз, яўрэя-бізнесмена, а таксама даведацца, як вырашылася галоўная інтрыга спектакля: ці здолеў Дзёмка перахітрыць Чорта і прайсці ўсе выпрабаванні?

Любоў СЫЦЬКО

Скарбонка Спадчыны

Навошта на Магілёўшчыне «аруць раку»? Бо даўно дажджу не было

Нашы продкі верылі, а старыя людзі, відаць, вераць і сёння, што ў сусвеце існуюць пэўныя формулы-ключы. Ведаючы іх, валодаючы адметнымі ўменнямі, чалавек можа стаць валадаром над сіламі прыроды. Напрыклад, выклікаць ці спыняць дождж, узмацняць ці суцішваць вецер, размаўляць з жывёламі і выведваць іх таямніцы. Праўда гэта ці не, навуковымі метадамі даказаць цяжка, цяжка знайсці, разгадаць тыя самыя формулы і праверыць іх доследным шляхам. Бо веды гэтыя таемныя, адкрываюцца яны не кожнаму, зберагаюцца варажбітамі і перадаюцца як вялікі сакрэт і каштоўнасць.

Але вясковыя жыхары і сёння вераць, што дзіўныя дзеянні, напрыклад, разбурэнне платоў, перанос варотаў у балота, сыпанне ў калодзеж маку, могуць выклікаць дождж. А музыкі, навукоўцы, якія ў сваёй рабоце і даследаваннях мелі магчымасць дакрануцца да каранёвай культуры беларусаў, заглыбіцца ў яе старажытныя пласты, часам згадваюць, што па неасцярожнасці ці праз няведанне, выканаўшы пэўную рытуальную песню, маглі справакаваць навальніцу ці моцны дождж.

Зрэшты, не ўсе таемныя рытуалы ўздзеяння на прыроду і надвор'е нават у нашы дні забыты ці схаваны пад пылам чалавечай памяці. Так, старадаўні абрад заклікання дажджу, што захаваўся ў вёсцы Стары Дзедзін Клімавіцкага раёна, з'яўляецца аб'ектам нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі і знаходзіцца пад аховай. Праўда, часам мясцовыя жыхары выказваюць незадаволенасць, маўляў, рытуальныя дзеянні выконваюцца на камеру, для журналістаў, без асаблівай патрэбы, таму прырода помсціць такой неабгрунтаванай гульні ў магію моцным дажджом, які цягнецца некалькі тыдняў, і просяць жанчын выканаць абрад з «адваротным» сэнсам, каб дождж спыніць.

Прычын узнікнення засухі нашы продкі знаходзілі шмат. Напрыклад, вядзьмарскае насланнё, выкананне людзьмі забароненых у пэўныя каляндарныя тэрміны дзеянняў. Так, справакаваць засуху можа ўстаноўка платоў і агароджаў да Дабравешчання, пастаўлены не ў свой час помнік на магіле, пахаваны тапелец, якому «ўсё мала вады», або самагубца, якога, супраць правіл, пахавалі на тэрыторыі могілак, а не за агароджаю. Каб не выклікаць засуху, нельга было нікому і нічога пазычаць у час пачатку ворыва, ускопвання градаў, засевак. Каб улетку не было засухі, трэба было адзначаць дзень прарока Ільі і аблівацца ў Сухі (Траецкі) чацвер вадою.

Па правілах, у абрадзе бяруць удзел толькі жанчыны, часта ініцыятаркамі выступалі ўдовы. Менавіта на іх гаспадарку, ураджай праз адсутнасць мужчынскай сілы доўгая адсутнасць дажджу ўплывае наймацней. Рытуал праводзіцца ў таямніцы ад іншых жыхароў вёскі, а яго ўдзельніцы, паводле традыцыі, павінны быць цалкам аголены. Праўда, сёння апошнія пункты з розных прычын не выконваюцца: за дзеяннямі жанчын назіраюць аднавяскоўцы, даследчыкі і журналісты, а самі жанчыны адзеты ў доўгія вышываныя кашулі.

Абрад арганізоўваўся і праводзіўся наступным чынам. Падчас спякотнага лета, калі дождж не ішоў месяц, жанчыны, ідучы з працы на абед, дамаўляліся пераараць раку Асцёр. Бралі плуг або саху і ў таямніцы ад мужчын і дзяцей, размаўляючы шэптам, кіраваліся да вады. Калі жанчыны падыходзілі да ракі, абавязкова чыталі «Ойча наш», хрысціліся, а потым да неба ўзнімалі дзве рукі, прасілі Бога, каб дапамог паліць зямлю, каб жыццё працягвалася. Казалі прыкладна такія словы: «Дай, Госпадзі, дапамажы, Госпадзі, прынясі вятры, прынясі нам хмары, арашы зямельку, напаі травы, поле, лясы, дай жыцця нашай зямельцы, каб добра ўрадзіла і ўсіх напаіла…». Пасля знімалі з сябе ўсё адзенне, заходзілі ў ваду і цягнулі па дне плуг — «аралі ваду». Дзве жанчыны цягнулі плуг, адна ішла за імі, яшчэ адна паганяла пугай або галінкай, астатнія стаялі на беразе і спявалі.

Уся дзея праходзіць пад песню:

Ой, не стаяла б ды белая бярозачка над вадою,
Не скланяла б яна сваё голле ўніз да долу.
А там дзеўка-чарнаброўка ваду брала,
Ваду брала ды размаўляла…

Упрагаліся ў плуг звычайна пажылыя, а моладзь «паганяла». Аралі раку толькі адзін раз. Напрыканцы таксама маліліся. Кажуць, што дождж часам пачынаўся праз гадзіну пасля гэтых дзеянняў, а былі выпадкі, калі трэба было пачакаць дзень ці два.

Марына ВЕСЯЛУХА

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
18.07.2019 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 1066

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 2252

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.